

Купіць кватэру з аўкцыёну

СТАР. 2



Экскурсія па верхавінах дрэў

СТАР. 3



Чым дапаможам суставам?

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛІПЕНЯ 2015 г. СЕРАДА № 132 (27990) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Выбары–2015

## Заяўлена першая ініцыятыўная група

**Учора раніцай у Цэнтральную камісію Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў былі прадстаўлены дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні Лукашэнкі Аляксандра Рыгоравіча кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, паведамілі ў Цэнтрвыбаркаме. Кіраўніком гэтай ініцыятыўнай групы з'яўляецца Міхаіл Сяргеевіч Орда — старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.**

Цэнтральная выбарчая камісія нагадвае, што дакументы для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы павінны быць прадстаўлены не пазней за 17 ліпеня. Рэгістрацыя ініцыятыўных груп праводзіцца ў пяцідзённы тэрмін з дня падачы адпаведнай заявы.

У найбліжэйшую пятніцу, 17 ліпеня, на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў будуць разгледжаны заявы асоб, якія маюць намер вылучыцца кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп выбаршчыкаў.

Не пазней за пятніцу павінны быць вызначаны і месцы, дзе правядзенне пікетавання для збору подпісаў выбаршчыкаў будзе забаронена. Прадстаўнікі ў тэрытарыяльныя камісіі павінны быць вылучаны не пазней за 19 ліпеня. Самі тэрытарыяльныя камісіі, згодна з Календаром выбараў, будуць створаны да 22 ліпеня.

## Садружнасць выбрала галоўнага назіральніка

**Кіраўнік Выканкама СНД Сяргей Лебедзеў узначаліць Назіральную місію ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў на выбарах Прэзідэнта Беларусі. Пра гэта паведамляе інтэрнэт-партал Садружнасці.**

«Мяне праінфармавалі, што ў чарговы раз я рэкамендаваны на пасаду кіраўніка місіі. Палічу гэта за гонар і з удзячнасцю буду выконваць такую працу», — заявіў Лебедзеў у аўторак у Мінску.

Па словах кіраўніка Выканкама, ён ужо падпісаў запрашэнні ўдзельнічаць у Назіральнай місіі СНД усім краінам Садружнасці, у тым ліку Украіне. «Вопыт паказвае, што з 11 дзяржаў прымаюць удзел дзевяць. У мінулы раз не ўдзельнічалі Украіна і Малдова», — сказаў Лебедзеў.

Ён дадаў, што ў найбліжэйшы час мае намер сустрэцца з кіраўніцтвам ЦВК Беларусі і абмеркаваць некаторыя моманты працы назіральнай місіі, у тым ліку колькасць назіральнікаў.

«Я глыбока ўпэўнены, што наш вопыт дапаможа дакладна арганізаваць гэтую работу. Наш аб'ектыўны падыход да назірання за выбарамі захаваецца», — сказаў Сяргей Лебедзеў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

## ПЯЦЬ НАПРАМКАЎ ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

### У Савеце Рэспублікі абмеркавалі магчымыя праекты новай краінавай Праграмы развіцця ААН для Беларусі

**Учора на сустрэчы ў верхняй палаце беларускага парламента старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч падзякаваў пастаяннаму каардынатару ААН — пастаяннаму прадстаўніку ПРААН у Беларусі Санаку Самарасінху за паспяховую і актыўную дзейнасць на гэтай пасадзе.**

— Узаемадзеянне ААН і Беларусі развіваецца дастаткова паспяхова і ў многім гэта заслуга вашай асабістай актыўнай пазіцыі, — сказаў ён высокаму госцю. — Думаю, што ў 2015 годзе будзе паспяхова завершана дзеючая краінавая праграма, і асабліва вітаю распрацоўку новай на 2016—2020 гады, падрыхтоўка праекта якой практычна ўжо завершана.

На сустрэчы былі абмеркаваны сумесныя прапановы па супрацоўніцтве кіраўніцтва Праграмы развіцця ААН і беларускага парламента. Старшыня Савета Рэспублікі абазначыў пяць яго асноўных напрамкаў.

СТАР. 2

# КУЛЬТУРНАЯ АЛІМПІЯДА З БЕЛАРУСКАЙ ПРАПІСКАЙ





## Наша краіна становіцца цэнтрам не толькі палітычнага, але і культурнага міжнароднага дыялогу

**Чарговы фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» парадаваў яркімі выступленнямі, падарыў сустрэчы з любімымі артыстамі і адкрыў новыя таленты. «Ён надоўга запомніцца багаццем ідэй, радасцю сустрэч і выключна разнастайнай праграмай», — адзначыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі закрыцця культурнага форуму.**

З кожным годам віцебскі фестываль мастацтваў набывае асаблівае значэнне ў справе ўмацавання міру і ўзаемаразумення паміж краінамі і народамі. «Мы шмат дзесяцігоддзяў таму менавіта гэта вызначылі галоўным. І хто б мог падумаць, што мы сёння будзем такімі актуальнымі ў нашым славянскім свеце? — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Таму мір, мір і яшчэ раз мір!»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў гэтым годзе ў «Славянскім базары» прымала ўдзел рэкордная колькасць краін — 42. «Ніколі ў гісторыі такога яшчэ не было. Паверце, мы зробім усё, каб не 42, а 142 дзяржавы былі тут, на нашай міралюбівай зямлі. І ў нас для гэтага ўсё ёсць. Беларусь усё больш упэўнена становіцца цэнтрам не толькі палітычнага, але і культурнага міжнароднага дыялогу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што геаграфічны цэнтр Еўропы знаходзіцца побач з Віцебскам. «Мы свята павінны захоўваць гэтую старажытную, развітую еўрапейскую цывілізацыю. І хто як не мы, знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, адказваем за яе», — лічыць беларускі лідар. Паводле слоў Прэзідэнта, аб гэтым сведчыць і той факт, што на пасяджэнні савета дырэктараў Сусветнай асацыяцыі фестываляў яе кіраўніком выбраны дырэктар «Славянскага базару».

«Мы пастаянна павінны клапаціцца пра папулярызацыю нашай славянскай культуры, яе інтэграцыю ў сусветную прастору», — адказаў кіраўнік дзяржавы скептыкам, ад якіх можна пачуць пытанні аб неабходнасці штогод праводзіць такі маштабны форум, як «Славянскі базар», і падтрымліваць яго фінансава. Ён падкрэсліў, што славянскім народам нельга самазаспакойвацца, таму што літаральна праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля кровапралітнай Вялікай Айчыннай вайны паўстала пытанне абароны Перамогі. «Хто мог бы падумаць, што нас паставяць на адну дошку з фашызмам, што нібы Савецкі Саюз некалі развязаў вайну? — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Хто мог бы падумаць, што праз некалькі дзесяцігоддзяў пры жывым пакаленні пераможцаў у нас захочуць адабраць гэтую Перамогу?»

«Мы вельмі самазаспакоіліся, думалі пра тое і радаваліся, што свет будзе такі, як мы хочам, — прадоўжыў беларускі лідар. — Не! Калі мы не змагаемся за сваё месца пад сонцам, мы абавязкова яго страцім, больш за тое — сутыкнёмся з тымі канфліктамі, якія ўжо адбываюцца ў нас на зямлі. Таму мы павінны цаніць сваё мастацтва, культуру ў шырокім сэнсе гэтага слова і папулярызаваць яе на ўсіх кантынентах, як гэта робіць «Славянскі базар».

«Грошы, хоць і важная ўмова, але не галоўная мерка для такіх мерапрыемстваў. Тым больш у гэтым годзе многае зроблена для таго, каб фестываль выйшаў на самаакупнасць. Мы практычна з дзяржаўнага бюджэту ў гэтым годзе фестываль не фінансавалі», — дадаў Прэзідэнт, выказаўшы словы ўдзячнасці мецэнатам, якія ўклалі свае сродкі ў цудоўнае свята.

Ва ўрачыстай атмасферы на цырымоніі закрыцця фестывалю Аляксандр Лукашэнка ўручыў спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» народнаму артысту Азербайджанскай ССР, заслужанаму дзеячу мастацтваў Рэспублікі Дагестан, доктару мастацтвазнаўства, прафесару Паладу Бюль-Бюль-аглы. Пры гэтым Прэзідэнт павіншаваў усіх паклоннікаў фестывалю з папаўненнем Алеі зорак. «Наша Алея аб'ядноўвае кумiраў розных пакаленняў і служыць сімвалам культурнай пераемнасці. Сёння тут стала на адну зорку больш — яна належыць выдатнаму выканаўцу, кампазітару і проста цудоўнаму чалавеку Паладу Бюль-Бюль-аглы. Няхай жа гэты праект з году ў год узбагачаецца новымі імёнамі, і наша Алея ператвараецца ў сапраўдную Плошчу зорак», — пажадаў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя ўзнагароды Паладу Бюль-Бюль-аглы, Аляксандр Лукашэнка ўпершыню ўручыў спецыяльны прыз Прэзідэнта Беларусі ўдзельніку Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «За яркае выкананне песень славянскіх народаў». Яго лаўрэатам стала Ганна Цвердаступ з Украіны.

СТАР. 3



Дымаш КУДАЙБЕРГЕН.



Валерыя ГРЫБУСАВА.

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір УЛАХОВІЧ, намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты:**

*«Сёння мы можам канстатаваць рост замежнай бізнес-цікавасці да Беларусі. Паглядзіце: разгар лета, але ў нас гэтымі днямі праходзяць два вялікія эканамічныя мерапрыемствы — кітайска-беларускі форум па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з правінцыяй Цінхай і беларуска-японская бізнес-сустрэча. Гэта сведчыць пра тое, што бізнес-цікавасць да нашай краіны нарастае. Гэта аб'ектыўна падкрэслівае тую ролю, якую сёння выконвае Беларусь і ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, і як прамысловая краіна, звернутая як да ЕАЭС, так і да ЕС».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15330,00 | ▲ |
| Еўра | 16834,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 268,60 | ▼ |
| Укр. грыўня | 695,24 | ▼ |

## АДПАЧЫНАК З КАРЫСЦЮ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

**Палова лета ўжо за плячыма. Як адпачываюць сёлета беларусы? Колькі дзіцячых лагераў працуе ў краіне? Ці запоўнены нашы санаторыі? Якія з іх найбольш запатрабаваны? Пра гэта расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

### ЛЕТА, СОНЦА, ЛАГЕР!

У першую змену прайшлі аздараўленне 223,5 тысячы беларускіх дзяцей — гэта каля 60% ад запланаваных лічбаў. Усяго ў краіне працавала 4 602 летнія лагеры. З іх 854 з кругласутачным знаходжаннем дзяцей і 3748 — з дзённым.

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### На бамбардзіроўшчыку Ту-95 перасталі дзейнічаць усе рухавікі



У стратэгічнага бамбардзіроўшчыка Ту-95, які разбіўся ў Хабараўскім краі, падчас палёту сталі ўсе чатыры рухавікі, пра што паведаміла крыніца ў сілавых структурах Расійскай Федэрацыі. У Мінабароны Расіі раней заявілі, што, як мяркуецца, прычынай аварыі стала няспраўнасць тэхнікі. Палёты Ту-95МС часова прыпынены. Бамбардзіроўшчык разбіўся ў 60 кіламетрах ад Хабараўска. Самалёт, які выконваў палёт без боекамплекта, упаў у бязлюдным раёне, на зямлі разбурэнняў няма. Паводле паведамлення ваенных, экіпаж у складзе сямі чалавек пакінуў машыну на парашутах.

### «Шасцёрка» і Іран прыйшлі да гістарычнага пагаднення

Іран і «шасцёрка» міжнародных пасрэднікаў (ЗША, Расія, КНР, Вялікабрытанія, Францыя, Германія) пасля шматгадовых перамоў узгаднілі сумесны комплексны план дзеянняў па канчатковым урэгуляванні іранскай ядзернай праблемы. У Вене ў аўторак адбылося вынiковае пленарнае пасяджэнне Ірана і «шасцёркі», пасля якога ўдзельнікі перамоў абвясцілі пра заключэнне пагаднення. Кіраўнік дыпламатыі ЕС Федэрыка Магерыні, прадстаўляючы пагадненне, адзначыла, што дакумент гарантуе мірны характар ядзернай праграмы Ірана. Яна назвала пагадненне «гістарычным днём для бяспекі ўсяго свету». Тлумачэнні па праекце рэзалюцыі даў журналістам і кіраўнік МЗС Расійскай Федэрацыі Сяргей Лаўроў. Паводле яго слоў, канчатковая дамоўленасць цалкам адпавядае той задачы, якая была пастаўлена ў расійскай канцэпцыі знешняй палітыкі, а менавіта дамагчыся прызнання права Ірана на мірную атамную дзейнасць, уключаючы права на ўзбагачэнне ўрану пры пастаноўцы гэтай дзейнасці пад пільны кантроль МАГАТЭ, пры зняцці з Ірана ўсіх санкцый. «Зброевае эмбарга па Іране захоўваецца на працягу пяці гадоў, але па рашэнні СБ ААН пастаўкі магчымы і ў гэты перыяд», — таксама заявіў Сяргей Лаўроў.

ISSN 1990 - 763X

15132>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Чай і кава эфектыўныя супраць анкалогіі

Гэтыя напоі, на думку еўрапейскіх навукоўцаў, здольны абараніць ад развіцця раку мозга (піша American Journal of Clinical Nutrition). Аб ідавочным супрацьракавым эфекце чаю і кавы сведчаць вынікі даследавання даных маштабнага апытання.Эксперты высветлілі, як уплывае частае спажыванне кавы і гарбаты на развіццё пухліны мозга. Даследаванне паказала: калі чалавек спажываў некаторыя напоі на працягу жыцця, ён гэтым засцерагаў сябе ад развіцця злаякасных пухлін. Эфектыўнай прафілактыкай ракавых працэсаў у мозгу з'яўляецца спажыванне кавы і чаю. Увогуле, у аматараў гэтых напояў быў выяўлены станоўчы эфект у дачыненні да такіх відаў пухлін мозга, як менінгіёма і гліёма. Напоі зніжалі на 35% рызыку іх з'яўлення. Дарэчы, іншая група навукоўцаў устанавіла, што дадзеныя напоі памяншаюць рызыку з'яўлення гліябластомы — аднаго з самых цяжкіх відаў раку мозга.



■ Спецыяльны рэпартаж

## СІЛЫ НЯБЕСНЫЯ

### Тое, што адны падпаляць, другія патушаць

**З маленства ведаем словы, якія ў кожным лясным кутку з плакатаў папярэджваюць: «агонь — вораг лесу», «не разводзь агонь у лесе», «патушы цыгарэту», «беражыце прыроду»... Здаецца, прытрымлівацца гэтага — што можа быць прасцей? Але з наступленнем летняй спякоты многія людзі, якія імкнуцца на ўлонне прыроды, быццам бы знарок пра яго забываюцца. Палаюць лясныя і балотныя вогнішчы, падымаюцца ў неба клубы дыму... Чалавечы фактар — самы распаўсюджаны ў экалагічных бедствах.**

**На выхадныя зноў абяцаюць спёку, зноў небяспека лясных пажараў будзе актуальнай. Зноў у паветра паднімецца лясны патруль — верталёты дзяржаўнага прадпрыемства «Беллесавія». Разам з лётчыкамі адной з найстарэйшых авіяцыйных баз прадпрыемства, Салігорскай, наш карэспандэнт дзяжурыў у небе ў першыя гарачыя дні ліпеня.**

СТАР. 3



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Камандзір верталёта пілот Сяргей КАСАБУЦКІ і пілот-назіральнік Андрэй ГАНЧАРЭНКА ўдакладняюць маршрут чарговага палёту.

## За падтрымку традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцей

### Сінод Беларускай праваслаўнай царквы выказаў удзячнасць Прэзідэнту

Аб гэтым гаворыцца ў журналах пасяджэння Сінода БПЦ, якія апублікаваны на афіцыйным сайце Беларускага экзархата, паведамляе БЕЛТА. «Выказаць глыбокую ўдзячнасць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку за падтрымку традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцей, прызнанне іх значнасці ў беларускай нацыянальнай культуры і важнасці для жыцця сучаснага чалавека», — сказана ў журналах. Як тлумачыцца ў паведамленні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі аб падзеях царкоўна-грамадскага жыцця з удзелам Прэзідэнта Беларусі, у прыватнасці 9 студзеня 2015 года кіраўнік дзяржавы ўдзельнічаў ва ўрачыстай цырымоніі ўручэння прэмій «За духоўнае адраджэнне». Мітрапаліт звярнуў увагу, што Прэзідэнт Беларусі ў тым ліку адзначыў у сваёй прамове: «Падтрымка хрысціянскіх каштоўнасцей, маральных, эстэтычных традыцый з'яўляецца адным з галоўных фактараў у развіцці беларускай нацыі».

«Беларускі лідар падкрэсліў асаблівую ролю духоўных каштоўнасцей ва ўмацаванні народнага адзінства», — зрабіў акцэнт Мітрапаліт Павел. Акрамя таго, Сінод вырашыў «выказаць надзею на ўмацаванне добрых адносін» паміж Прэзідэнтам Беларусі і БПЦ на карысць народа.

## ПЯЦЬ НАПРАМКАЎ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У першую чаргу, гэта пытанні, звязаныя з забеспячэннем адпаведнасці нацыянальнага заканадаўства тым міжнародным абавязкам і падыходам, якія прадугледжаны чарговай краінавай праграмай.

— Гэта, безумоўна, запатрабуе стварэння адпаведных працоўных органаў, маю на ўвазе, не на пастаяннай аснове, а на факультатыўнай, — дадаў парламентарый. — Нам будзе вельмі карысны вопыт ААН па падтрымцы развіцця, у тым ліку і парламенцкай дзейнасці.

У асобны блок пытанняў Міхаіл Мясніковіч вылучыў дзяржаўна-прыватнае партнёрства. «Зараз Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах разглядае адпаведны законапраект, і я думаю, што работа над дакументам у цесным кантакце з вамі можа быць вельмі карыснай. Гэта датычыцца і інстытуцыянальных рэформ, і стратэгічнага планавання, і рэгулятыўнай базы, і многіх іншых пытанняў, уключаючы выяўленне магчымай рызыкі сістэмы кантрактаў», — звярнуўся да каардынатара ААН у Беларусі Міхаіл Мясніковіч.

Спікер верхняй палаты дадаў, што Беларусь па-ранейшаму лічыць актуальнымі пытанні энергаэфектыўнасці і экалагічнай адказнасці. Нельга пакідаць і сумесную работу ў сферы аховы здароўя, правоў жанчын і дзяцей, а таксама іншыя пытанні парламенцкай працы над завяршэннем праекта краінавай праграмы на наступны перыяд і яе далейшай рэалізацыі.

Праграма развіцця ААН — ключавая структура сістэмы Арганізацый Аб'яднаных Нацый. Яна аказвае экспертнае садзейнічанне краінам, якія развіваюцца, і краінам з пераходнай эканомікай па шырокім спектры напрамкаў, каардынуе дзейнасць у галіне развіцця спецыялізаваных устаноў ААН. Нараўне з прадастаўленнем сродкаў з уласных бюджэтных рэсурсаў для рэалізацыі праектаў тэхнічнага садзейнічання актыўна мабілізуе рэсурсы міжнародных донараў.

Аб'ём праграмнай дзейнасці ПРААН складае каля 7 млрд долараў ЗША ў год, што перавышае рэгулярны бюджэт самой Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Праграма мае прадстаўніцтва больш чым у 130 краінах свету, якія адначасова выконваюць функцыі дыпламатычных місій ААН. Беларусь была першай дзяржавай на прасторы былога СССР, дзе ў 1992 годзе было адкрыта прадстаўніцтва ПРААН.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

## Малдова стане бліжэй

**Прэзідэнт Малдовы Мікалай Цімафці прыбывае сёння з двухдзённым афіцыйным візітам у нашу краіну, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

У Мінску запланаваны сустрэчы Прэзідэнта Малдовы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам у фармаце сам-насам і ў пашыраным складзе. Акрамя таго, Мікалай Цімафці сустрэнецца з прэм'ер-міністрам Беларусі Андрэем Кабяковым, старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам Мясніковічам і старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам. Плануецца, што ў прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў у Мінску будзе падпісаны пакет дакументаў па шэрагу напрамкаў беларуска-малдаўскага супрацоўніцтва.

Прэзідэнт Беларусі зрабіў візіт у Малдову 24-25 верасня 2014 года. На перамовах у Кішынёве прэзідэнты Беларусі і Малдовы дамовіліся аб пашырэнні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Аляксандр Лукашэнка назваў перспектыўным супрацоўніцтва Беларусі з Малдовай у вытворчай кааперацыі для выхаду на рынкі трэціх краін і ЕС і нарошчвання двухбаковага тавараабароту.

■ Тры пытанні да ўлады

## Свята на радзіме Касцюшкі стане брэндам

**Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказаў намеснік старшыні Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандр ВЯЛІКАСЕЛЕЦ.**



***— Аляксандр Фёдаравіч, з'явілася зусім скупая інфармацыя пра свята, прысвечанае Тадэвушу Касцюшку. Прыадкрыйце, калі ласка, сакрэт імпрэзы.***

— Сакрэты арганізатараў і сцэнарыстаў я якраз не маю права адкрываць. Скажу, што ідэя такога свята выспявала даўно. У Марачоўшчыне, на радзіме Касцюшкі, паспяхова працуе Дом-музей яго імя, сюды едуць турысты. Раней мы праводзілі мерапрыемства ў гонар героя трох кантынентаў 4 лютага, у дзень яго нараджэння. Але зімой, асабліва калі холадна, шмат народу не збярэш. Таму і вырашылі зрабіць культурна-гістарычную акцыю, якую можна назваць, відаць, брэндавым святам, у канцы лета. Спадзяёмся, што яно ў нас атрымаецца і з цягам часу перарасце з раённай падзеі ў нешта больш маштабнае, накшталт «Ружанскай брамы» альбо іншых пазнавальных культурных праектаў, што ажыццяўляюцца ў вобласці, прывабіць больш турыстаў.

***— Сёлета, пэўна, вялікія намаганні былі накіраваны на годнае правядзенне 70-гадовага юбілею Перамогі.***

— Так, і думаю, што гэтую дату мы адзначылі на ўзроўні. Цёплыя сустрэчы прайшлі ў кожным сельсавеце. Нашы работнікі, актыў імкнуліся не забыць ніводнага ветэрана. А галоўнае раённае мерапрыемства мы па традыцыі правялі ва ўрочышчы Хаваншчына, дзе падчас вайны фактычна на востраве, акружаным балотамі, знаходзіліся штаб партызанскага руху, падпольныя абкамы партыі і камсамола, выходзіла падпольная газета «Заря». Там сабраліся прадстаўнікі і старэйшага, і маладога пакаленняў. Знайшлося месца тэатралізаванай дзеі з удзелам клубаў гістарычнай рэканструкцыі, успамінам, словам падзякі і пашаны ветэранам.

5 ліпеня, напярэдадні дня вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, традыцыйная сустрэча ветэранаў адбылася ва ўрочышчы Гута-Міхалін. Пачалося мерапрыемства з памінальнай малітвы, потым адбыўся мітынг-рэквіем. На Гута-Міхалінскіх могілках пахавана 175 чалавек, якія загінулі за Перамогу. Прадоўжылася мерапрыемства ў Красевіцкім доме культуры, дзе гучалі песні ваенных гадоў, частавалі салдацкай кашай. Ветэранаў віталі самадзейныя артысты і народныя майстры.

***— Дарэчы, пра народных майстроў. Аляксандр Фёдаравіч, далёка за межамі раёна вядома мастацтва івацэвіцкіх вышывальшчыц. Іх творы бываюць на абласных, рэспубліканскіх фэстах і выставах. Што робіцца для прапаганды іх творчасці ў раёне?***

— Найперш тое, што нашы работнікі культуры арганізоўваюць выставы, даюць магчымасць майстрыхам паказаць сваю творчасць людзям, асабліва маладому пакаленню. А крыху больш за месяц таму выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці народных майстроў Івацэвіцкага раёна прайшла ў фае Авальнай залы парламента. Заслуга ў яе арганізацыі належыць найперш дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны Леаніду Кавалевічу. Выстава адкрылася якраз перад сумесным пасяджэннем абедзвюх палат парламента. Прыгажосць, створаную рукамі нашых жанчын, змаглі паглядзець і дэпутаты, і сенатары. Там былі работы Людмілы Арцюшэнкі з Целяхан, Раісы Брашковай і Ніны Гейдзюк з Яглевіч, Марыі Гойшык з Руды. Наколькі нам вядома, наведвальнікі выставы вельмі цёпла адзываліся аб творчасці вясковых жанчын, шчыра дзякавалі ім і прасілі перадаваць сакрэты майстэрства дзецям і моладзі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Кашалёк

## НЕ СКУБІ, ПАКУЛЬ НЕ ЗЛОВІШ

### «Мінскбуд» пачаў масавы продаж кватэр на аўкцыёне

**Днямі на сайце «Мінскага гарадскога цэнтра нерухомасці» з'явілася паведамленне аб аўкцыёне. Там было выстаўлена на продаж адразу 17 жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці галоўнага мегаполіса краіны.**

### 12 ПЛЮС 5

Пяць выстаўленых на продаж лотаў маюць прапіску ў доме па праспекце газеты «Праўда», а яшчэ дванаццаць — у новым доме на вуліцы Налібоцкая ў мікрараёне Каменная Горка. Абодва каркасныя дамы былі здадзены ў эксплуатацыю яшчэ ў пачатку года, а новымі жыхарамі яны былі заселены ў сакавіку-красавіку. Будынкі падобнага тыпу даволі цёплыя, бо там пры будаўніцтве выкарыстоўваліся тэхналогіі па класе энергаэфектыўных дамоў. Самі выстаўленыя на аўкцыён кватэры звычайныя па плошчы для сваёй катэгорыі. Агульная плошча аднапакаёвак вагаецца ад 35 да 41 квадратнага метра, але ёсць адна і да 52 «квадратаў». Двухпакаёвыя кватэры маюць памер ад 53 да 61 квадратнага метра, а трохпакаёўкі — каля 74 квадратных метраў. Усе гэтыя жылыя памяшканні прапануюцца на продаж без апрацоўкі.

Кватэры ў дамах маюць высокія столі 2,75 метра. Трэба заўважыць, што кватэры ў Каменнай Горцы па Налібоцкай прадаюцца таксама і прыватнымі ўладальнікамі. У іх інфармацыя ў рэкламных аб'явах больш падрабязная. Сам дом апісваецца як каркасна-блочны павышанай камфортнасці, дзе ёсць чатыры хуткасныя ліфты, відэаназіранне, кансьерж і французскія вокны.

### УМОВЫ І КОШТЫ

У аўкцыёне могуць прымаць удзел любыя арганізацыі і фізічныя асобы, у каго ёсць грошы і жаданне гэтую нерухомасць набываць. Абмежаванняў няма ніякіх. Заплаціў 10% задатку ад першапачатковага кошту лота, падпісаў пагадненне з арганізатарам аўкцыёна — і наперад. Падатковыя органы, вядома, маюць права запатрабаваць у пакупніка дарагой нерухомасці дэкларацыю аб даходах і маёмасці. Але для законапаслухмянага жыхара нашай краіны гэта не праблема.

Аўкцыённыя таргі ажыццяўляюцца ў форме адкрытага аўкцыёну на павелічэнне першапачатковай цаны. Калі на кватэру будзе прэтэндаваць толькі адзін заяўнік, яна можа быць прададзеная па стартавым кошце плюс 5%. Выкарыстанне нейкіх мэтавых крэдытаў тут не вітаецца, бо пакупнік набытай нерухомасці павінен цалкам за яе разлічыцца на працягу 15 працоўных дзён з моманту заключэння дагавора куплі-продажу.

Зараз аб коштах. Самая маленькая па плошчы кватэра (35 квадратных метраў) мае на аўкцыёне першапачатковы кошт у памеры 652,7 млн рублёў, або 42,25 тысячы долараў. Такім чынам, квадратны метр у такім жыллі каштуе 18,65 млн рублёў, ці прыкладна 1200 долараў. Пры павелічэнні метражу кватэры цана квадратнага метра памяншаецца. Напрыклад, трохпакаёвая кватэра па вуліцы Налібоцкай плошчай 74,1 квадратнага метра прапануецца за 1 млрд 154,62 млн рублёў. У гэтым выпадку кошт «квадрата» складае 15,58 млн рублёў, або каля тысячы долараў. Для дамоў павышанай камфортнасці гэта сапраўды нядорага, калі не ўлічваць адно «але». Сам механізм аўкцыёну прадугледжвае павелічэнне цэннікаў, калі першы мінімальны крок складае 5%. Далёка не факт, што да стартавага кошту кватэры чалавек з малатком прыплюсуе толькі 5 або 10%. Аднак і арганізатары пакуль не ўпэўнены, што на аўкцыён прыйдзе вялікая колькасць патэнцыяльных пакупнікоў.

### АХВЯРЫ АЖЫЯТАЖНАЙ ХВАЛІ

Каб удакладніць сітуацыю вакол гэтых кватэр, мы звярнуліся ў аддзел рэалізацыі «Мінскбуда». Там нам паведамілі, што напрыканцы мінулага года і ў першы месяц сёлета на фоне хістанняў на валютным рынку пэўная частка людзей істэрычна ўкладвала свае грошы ў любыя праекты. У тым ліку і ў будаўніцтва жылля. Аднак не ўсе змаглі гэта будаўніцтва цалкам пацягнуць. Нехта разлічваў, што наш рубель моцна патаннее. Таму пэўная доля так званых прыватных інвестараў у жыллё скасавала свае дагаворы з забудоўшчыкам. Такім чынам у яго і з'явіліся гэтыя 17 свабодных кватэр.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Без бюракратыі

## «ВОБЛАЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ» — СУПРАЦЬ ПАПЕР І СПРАВАЗДАЧ

**Сваім досведам, як з дапамогай сучасных IT-тэхналогій можна спрасціць кіраўнікам навучальных устаноў і педагогам жыццё, на калегіі Міністэрства адукацыі падзяліліся прадстаўнікі аддзела адукацыі, спорту і турызму Шчучынскага райвыканкама.**

— Для змяншэння дакументаабароту і эканоміі часу было вырашана зрабіць стаўку на так званыя «воблачныя тэхналогіі», — расказала **намеснік начальніка аддзела Жанна МЯЦЬКО.** — Гэтыя тэхналогіі прадугледжваюць аддаленую апрацоўку і захоўванне дадзеных з выкарыстаннем інструментаў і магутнасцяў інтэрнэту.

Фактычна ў віртуальнай прасторы створана рэгіянальная структурная мадэль захоўвання і абмену інфармацыяй. Для працы з дакументамі выкарыстоўваюцца матэрыялы сховішчаў упраўлення адукацыі вобласці, абласнога інстытута развіцця адукацыі і раённага аддзела.

Спецыялісты размяшчаюць на «воблаку» (віртуальным серверы) свае планы работы, тут жа знаходзяцца вынікі анкетавання педагогаў, даведнікі, матэрыялы актыўнай перапіскі і матэрыялы метадычнага характару, іншая карысная інфармацыя. Усё гэта дае магчымасць работнікам аддзела і вучэбна-метадычнага кабінета ў любы момант і з любога працоўнага месца з імі азнаёміцца. Установам адукацыі цяпер не трэба самастойна захоўваць і перадаваць інфармацыю, якая ў любы момант можа спатрэбіцца кіруючым структурам. Да таго ж з'явілася выдатная магчымасць для параўнання колькасных характарыстык дзейнасці розных устаноў адукацыі ў рэжыме рэальнага часу.

У інтэрнэце можна, напрыклад, аналізаваць занятасць школьнікаў у летні перыяд, правядзенне і наведвальнасць педагагічных саветаў і г.д . Без асаблівых выдаткаў часу ў анлайн-рэжыме вырашаюцца праблемы інфармацыйнага суправаджэння штодзённага кіравання, сумеснага стварэння і рэдагавання дакументаў, карэкціроўкі інфармацыі і абмену вынікамі сумеснай дзейнасці. Для сістэматызацыі напрацаванай інфармацыі створаны блог «Кіраванне якасцю адукацыі».

Пасля нарад, праведзеных аддзелам адукацыі, на старонках віртуальнага рэсурсу вывешваецца ўся неабходная інфармацыя для выканання прынятых рашэнняў. Напрыканцы навучальнага года на «воблаку» працаваў кансультацыйны пункт «Выпускны экзамен» і вёўся аператыўны збор інфармацыі. Праца ў анлайн-рэжыме дазволіла выявіць і выправіць памылкі ў ходзе правядзення экзаменаў, і ўжо 11 чэрвеня мець абагульненую інфармацыю па ўсіх школах і ўсіх прадметах. У Шчучынскім раёне створаны і паспяхова працуюць сеткавыя суполкі дырэктараў школ і раённых трэнераў школы «Інтэлект».

**Напрыканцы навучальнага года на «воблаку» працаваў кансультацыйны пункт «Выпускны экзамен» і вёўся аператыўны збор інфармацыі.**

І ўсё ж такі Жанна Мяцько не лічыць «воблачныя тэхналогі» панацэяй ад памылак у кіраванні. «Гэта толькі магутны інструмент у павышэнні яго эфектыўнасці, — падкрэсліла яна. — Іх выкарыстанне патрабуе ад кіраўніка не толькі свабоднага валодання камп'ютарнымі тэхналогіямі, але і высокага ўзроўню кампетэнтнасці ў сферы сваёй дзейнасці, умення структураваць і аналізаваць атрыманую інфармацыю. Выкарыстанне «воблачных сэрвісаў» — моцны стымул для самаразвіцця і самаўдасканалення...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Меркаванне

## ГРЭЧАСКІ ДЫЯГНАЗ



**Рашэнні па Грэцыі, агучаныя пасля неверагодна працяглага саміту 13 ліпеня, безумоўна, можна назваць доўгачаканым пазітывам, прынамсі на найбліжэйшыя гады. Праблема грэчаскага доўгу і нежаданне грэчаскага ўрада ісці далей на поваДзе ў крэдытораў стала вельмі негатыўным фактарам не толькі для Балкан, але і для ўсяго Еўрасаюза. Больш за тое, гэта праблема аказала дрэнны ўплыў і на ўсю Еўропу.**



Нявызначанасць, якая доўжыцца месяцамі з прычыны таго, ці застанецца Грэцыя ў зоне еўра і калі не застанецца, то як гэта адаб'ецца на ўсёй эканоміцы Еўрасаюза, вельмі негатыўна ўплывала на бягучы стан і перспектывы ўсёй еўрапейскай эканомікі. Каб зразумець чаму, дастаткова ўявіць сябе на месцы інвестара.

Кожны інвестар ужо азнаёміўся з мноствам змрочных прагнозаў наконт таго, што, калі Грэцыя выйдзе з зоны еўра і абвесціць дэфолт, еўразону чакае моцнае ўзрушэнне, якое можа прывесці да краху еўра, а то і ўсёй ідэі Еўрасаюза. І хто ж захоча інвеставаць у еўрапейскую эканоміку пры такім раскладзе? Грэчаскі крызіс месяцамі зніжаў прывабнасць Еўропы для інвестараў, запавольваючы тэмпы аднаўлення еўрапейскіх краін пасля сусветнага фінансавага крызісу. Гэта было вельмі дрэнным фактарам і для нас на фоне прасядання расійскага і ўкраінскага рынкаў.

Дасягнутая дамоўленасць, у адпаведнасці з якой Грэцыя ўсё ж застаецца ў еўразоне і нават атрымае дадатковыя 86 мільярдаў еўра, каб паспрабаваць выблытацца з назапашаных праблем, з'яўляецца пазітывам на найбліжэйшыя гады, але ўсё ж выклікае дадатковыя асцярогі.

Першая з іх дастаткова традыцыйная — у апошнія месяцы ўзрасла колькасць тых, хто хацеў выпіхнуць Грэцыю з еўразоны, каб даць іншым краінам жорсткі ўрок. Прыхільнікі гэтай ідэі лічаць, што трэба пакараць Грэцыю за няздольнасць аднавіцца пасля крызісу і нежаданне ва ўсім падпарадкавацца крэдыторам, каб іншым краінам еўразоны ў будучыні непанадна было ісці тым жа шляхам. Да ліку прыхільнікаў гэтай пазіцыі належаць многія ўплывовыя палітыкі з краін-крэдытораў Грэцыі, якія не задаволены тым, што іх урады пагадзіліся выдзеліць сотні мільярдаў еўра для выратавання грэчаскай эканомікі.

Да іх далучыліся і многія палітыкі з Усходняй Еўропы. Менавіта іх пазіцыю агучыла Еўрагрупа, парэкамендаваўшы ЕС 12 ліпеня прапанаваць Грэцыі часовы выхад з еўразоны, калі яна не пагодзіцца на фінальныя ўмовы крэдытораў. У той жа час наўрад ці можна лічыць, што большасць членаў Еўрагрупы падзяляла гэты настрой. Хутчэй, яны выкарыстоўвалі яго ў якасці ўдалага сродку шантажу, каб унушыць грэчаскаму ўраду ідэю, што далейшыя ўступкі не магчымы і ў выпадку ўпартасці Грэцыя можа апынуцца за бортам еўразоны. Справа ў тым, што ў членаў Еўрагрупы былі сур'ёзныя падставы самім асцерагацца падобнага сцэнарыя.

У выпадку выхаду Грэцыі з еўразоны была вялікая верагоднасць сур'ёзнага банкаўскага калапсу, страты ад якога маглі аказацца больш сур'ёзнымі, чым выдзяленне Грэцыі дадатковых сродкаў на змякчэнне негатыўных сацыяльных наступстваў ад рэжыму эканоміі. Спачатку маглі абваліцца грэчаскія банкі, дзейнасць якіх у апошнія тыдні і так ужо замарожана. А гэта б выклікала сур'ёзны ўдар па фінансавай сістэме балканскіх краін, дзе грэчаскія банкі вельмі актыўныя. Паралельна пад ударам бы аказаліся банкі краін ЕС, якія панеслі б сур'ёзныя страты ад грэчаскага дэфолту. І наколькі цяжкім быў бы гэты ўдар, тэарэтычна прадказаць немагчыма, бо ў такой сітуацыі непазбежна ўзнікла б паніка на фінансавых рынках, загадзя непрадказальная па наступствах.

Другую асцярогу, якая заключаецца ў тым, што 13 ліпеня ўдалося толькі адтэрмінаваць грэчаскі крызіс, а не вырашыць яго, таксама можна зразумець. Міне яшчэ некалькі гадоў, грошы, выдзеленыя Грэцыі, таксама будуць патрачаны. І што потым? Зноў некалькі месяцаў балансавання на мяжы выхаду з еўразоны, якія наносяць шкоду ўсёй еўрапейскай эканоміцы? Які эканамічны цуд павінен адбыцца, каб грэчаская эканоміка запрацавала з прыбыткам, што дазволіць вярнуць сотні мільярдаў еўра, у сітуацыі, калі ніхто не хоча інвеставаць у яе, з прычыны ўсеагульнай упэўненасці ў тым, што падобных цудаў не бывае?

Трэцяя асцярога заключаецца ў тым, што грэчаскае грамадства можа не прыняць дасягнутыя на саміце еўразоны дамоўленасці. Яны вельмі ўжо моцна супярэчаць таму, што грэчаскія выбаршчыкі запатрабавалі на рэферэндуме 5 ліпеня. Па-ранейшаму давядзецца ўціскацца бюджэтнікам і неабходна будзе захоўваць меры эканоміі. Ці прымуць яны тлумачэнні, што палітыка з'яўляецца мастацтвам магчымага і ўрад выбіў у еўрапартнёраў толькі тое, што аказалася яму па сілах, вымушана здаўшы іншыя абавязацельствы? Як стала вядома, грэчаскі прафсаюз дзяржаўных служачых ужо заклікаў выйсці на акцыю пратэсту грамадзян 15 ліпеня. Ці ўдасца Грэцыі захаваць стабільную ўладу, без якой дасягнутыя дамоўленасці зноў могуць быць адкліканы?

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Добрая навіна

## СА СТАРОГА — У НОВАЕ

### На Брэстчыне выканалі гадавое заданне па будаўніцтве жылля

**Перад вобласцю ставілася сур'ёзная задача — за год пабудаваць жылля агульнай плошчай 540 тысяч кв.м. З ёй у рэгіёне, на радасць будучых навасёлаў, справіліся надзвычай хутка: ужо здадзена 552 тысячы кв.м кватэр. «Па агульным уводзе жылля Брэсцкая вобласць знаходзіцца на другім месцы пасля Мінскай, па ўсіх астатніх паказчыках — на першым месцы ў рэспубліцы. Мы апярэджваем нават Гродзенскую вобласць, якая раней традыцыйна лічылася лідарам у гэтай сферы», — адзначыў намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Віктар Сакоўскі.**

У тым, што сёлета Брэстчына выканае абсалютна ўсе паказчыкі па жыллі, намеснік старшыні аблвыканкама нават не сумняваецца. Так, ужо справіліся з заданнем па будаўніцтве памяшканняў для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (пабудавана 260 тысяч кв.м пры гадавым заданні ў 250 тысяч кв.м). Для шматдзетных сем'яў узведзена 558 з запланаваных 700 кватэр.

У два разы больш, чым планавалася, пабудавана жылля для грамадзян, якія пражываюць у інтэрнатах 10 і больш гадоў. Плануецца ўзвесці 128 дамоў у вёсцы і 135 кватэр сацыяльнага карыстання. 103 сям'і, якія жывуць у старых і аварыйных дамах, неўзабаве пераселяцца ў новае жыллё.

Па словах Віктара Сакоўскага, адно з самых актуальных пытанняў на сёння — крэдытаванне. «У сувязі з тым, што бюджэт выконваецца не так, як хацелася б, недастаткова сродкаў на крэдытаванне індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Зараз выдаюцца крэдыты тым грамадзянам, у якіх заканчваюцца крэдытныя лініі ў бягучым і наступным месяцах. Гэтыя пытанні мы закрываем. А калі ў чалавека яшчэ два гады — тады трэба пачакаць. Тым больш што грошы на гэтыя мэты прадугледжаны».

**Надзея ПАЎЛАВА**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПАД «ПАРАСОНАМ» НЕ СХАВАЕШ

**Рэкламаваць алкаголь і тытунь пры дапамозе іншай прадукцыі забаранілі.**

Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе» ад 10 ліпеня прадугледжвае забарону на выкарыстанне так званых парасонавых брэндаў вытворцаў алкаголю і тытуню. Гэта значыць, што цяпер на тых пляцоўках, дзе нельга рэкламаваць непасрэдна саму алкагольную і тытунёвую прадукцыю, аналагічная норма будзе прымяняцца і да падобнай да яе рэкламы (напрыклад, пітной вады, якая прадаецца пад тым жа брэндам, што і гарэлка, або сухарыкаў пад адной маркай з півам). Забарона датычыцца таксама культурных, адукацыйных, спартыўных і іншых гуманітарных мерапрыемстваў.

Прадугледжваецца і шэраг выключэнняў. Напрыклад, калі рэклама ўяўляе з сябе інфармацыю аб прамысловым ці гандлёвым аб'екце, арганізацыі або грамадзяніне і размяшчаецца на вывесцы або ўказальніку. Акрамя таго, не забараняецца рэклама брэнда ў форме інтэрв'ю пра дзейнасць арганізацыі або грамадзяніна. Сацыяльная рэклама таксама можа ўтрымліваць выяву тавару або яго ўпакоўкі, якая падобна да алкагольнага ці тытунёвага вырабу або яго ўпакоўкі.

Закон уступіць у сілу праз тры месяцы з дня яго апублікавання. З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца на 5-й старонцы «Звязды».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## З ПАРКОЎКАЙ СТАНЕ ЛЯГЧЭЙ

**Прыкладна 1200 парковачных месцаў плануецца стварыць у мінскіх дварах у другім паўгоддзі. Аб гэтым паведаміў на пасяджэнні камісіі па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху пры Мінгарвыканкаме галоўны інжынер аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Ігар ГАНЧАРЫК.**

Спецыяліст распавёў, што ў першым паўгоддзі ў сталіцы было адрамантавана больш за 60 тысяч квадратных метраў дваровых праездаў, рэканструявана і пабудавана 11 новых кантэйнерных пляцовак. «Яшчэ сёлета ў дварах плануецца пабудаваць 74 кантэйнерныя пляцоўкі, адрамантаваць 39 тысяч квадратных метраў асфальтавага пакрыцця дваровых праездаў, уладкаваць 1260 дадатковых парковачных месцаў і разваротных пляцовак», — сказаў Ігар Ганчарык.

Сёлета жыллёвымі эксплуатацыйнымі арганізацыямі горада сумесна з Дзяржаўтаінспекцыяй праведзена 140 рэйдаў з мэтай выяўлення і спынення парушэнняў вадзіцелямі правіл паркоўкі, стаянкі аўтатранспарту ў дварах, а таксама хуткаснага рэжыму руху машын у жылых зонах. Паводле вынікаў праверак, аўтаўладальнікам выдадзена больш як 2 тысячы папярэджанняў, з дваровых тэрыторый адбуксіравана 205 аўтамабіляў, якія перашкаджалі працы спецаўтатранспарту.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ПРАЦА ДЛЯ СУСЕДА

**У спісе пастаянна каля 160 вакансій для грамадзян Украіны, жадаючых пачаць новае жыццё ў Магілёўскай вобласці.**

Дэкрэт аб сацыяльным утрыманстве на ўкраінцаў не распаўсюджваецца, але гэта той выпадак, калі без працы ў чужой краіне не пражывеш.

— З пачатку года да нас звярнулася 497 грамадзян Украіны, з якіх 324 чалавекі працаздольнага ўзросту, — паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Алена ЯКАЎЛЕВА**. — На 1 чэрвеня мелася 185 вакансій у 52 арганізацыях вобласці, прычым 81 — з прадастаўленнем жылля. У асноўным былі запрашэнні з сельскай мясцовасці на рабочыя спецыяльнасці. Попытам карысталіся таксама ўрачы, у прыватнасці ветэрынарныя.

Летась ахвотных працаўладкавацца было значна больш, як сведчаць спецыялісты, але хапае іх і цяпер. Інфармацыя на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пастаянна абнаўляецца, адны вакансіі закрываюцца, з'яўляюцца іншыя. Ад патэнцыйнага суіскальніка патрэбны дакумент аб рэгістрацыі і згода наймальніка ўзяць яго на працу. Жыхары Луганскай і Данецкай абласцей, якіх сярод мігрантаў большасць, па заканадаўстве вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны. «Але людзі па-рознаму выкарыстоўваюць свой шанц пачаць у нас новае жыццё, — кажа Алена Якаўлева. — На жаль, ёсць і негатыўныя прыклады, калі чалавеку прадастаўляюць жыллё, плацяць пад'ёмныя, а ён нечакана знікае ў невядомым кірунку. Супакойвае толькі тое, што большасць людзей усё ж такі паводзіць сябе добрасумленна».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## «WI-FI» НА КОЛАХ

**У Гомелі бясплатны Wi-Fi тэсціруюць пасажыры аднаго з аўтобусаў маршрута № 20 Медгарадок-Старая Валатава. У салоне ёсць інструкцыя для падключэння да інтэрнэту з указаннем лагіна і пароля.**

Ініцыятарамі выступілі «Гомельаблпасажыртранс» сумесна з аўтобусным паркам №6. Для гэтага набылі і ўсталявалі спецыяльны роўтар з магчымасцю вялікай колькасці падлучэнняў. **Начальнік дыспетчарскага сектара арганізацыі руху прадпрыемства «Гомельаблпасажыртранс» Ілья АЎДЗЕЕНКА** расказаў, што дапамогу ў доступе да інтэрнэту пагадзіўся аказваць адзін з мабільных аператараў.

Папярэдне было праведзена сацапытанне на афіцыйным сайце прадпрыемства. У выніку 92% карыстальнікаў выказаліся, што маюць жаданне ў грамадскім транспарце праглядаць сайты, пазбягаючы пры гэтым выдаткаў.

Тэст-драйв прадоўжыцца два тыдні. У аўтобусным парку спадзяюцца, што дадатковая паслуга павялічыць якасць абслугоўвання, выкліча пазітыўныя водгукі ў мабільных гараджан і прыцягне больш пасажыраў. Магчыма, хтосьці захоча перасесці з асабістага транспарту на грамадскі — з бясплатным Wi-Fi.

Аператар мабільнай сувязі на працягу гэтых двух тыдняў адсочвае колькасць падключэнняў у аўтобусе, каб высветліць, наколькі актыўна людзі выкарыстоўвалі бясплатны інтэрнэт падчас паездкі. Аўтобусны парк пралічыць выручку і вызначыць, ці прыцягнула новаўвядзенне дадатковых пасажыраў. Ці з'явіцца з часам Wi-Fi на іншых маршрутах, залежыць ад вынікаў эксперымента.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

# КУЛЬТУРНАЯ АЛІМПІЯДА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цёплыя віншаванні Аляксандр Лукашэнка адрасаваў пераможцам і прызёрам песенных конкурсаў сярод дарослых і дзяцей. У прыватнасці Дымашу Кудайбергену з Казахстана, які заваяваў Гран-пры ў конкурсе маладых выканаўцаў. Прыемна, што беларуска Валерыя Грыбусава атрымала «срэбра» — Першую прэмію. А сярод юных талентаў найлепшы вынік — у Луізы Нуркуатавай. Дарэчы, яна таксама з Казахстана. Першую прэмію атрымала Дарына Галіцкая з Украіны, другую падзялілі паміж Стафаніяй Сакаловай з Беларусі і Лізі з Грузіі. А яшчэ адна наша маленькая зямлячка Элеці і расіянка Соф'я Лапухова атрымалі спецыяльныя прызы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.


Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

«Перамога ў такім няпростым спаборніцтве — гэта сур'ёзная заяўка на будучыню. Ва ўмовах конкурснай барацьбы чалавек праяўляе не толькі яркасць свайго таленту, але і сілу характару», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Маштабныя творчыя праекты, конкурсы адыгрываюць выключна важную ролю ва ўмацаванні дружбы паміж народамі, дапамагаюць людзям розных нацыянальнасцей і культур лепш зразумець адно аднаго. «Калі гавораць музы, хацелася б, каб гарматы маўчалі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Удзельнікі і дзіцячага, і дарослага конкурсаў стварылі сімвалічнага голуба міру (які стане экспанатам музея «Славянскага базару») і паставілі на ім свае подпісы, каб ён заклікаў людзей да сяброўства, добрасуседства, добрых адносін. Аляксандр Лукашэнка па іх просьбе таксама там распісаўся.

* * *

Да ліку прыроджаных адносяцца і спадчынныя парушэнні злучальнай тканкі. Варта адразу патлумачыць, што касцявая і храстковая тканкі — разнавіднасці злучальнай, якая ёсць і ў скуры, і ва ўнутраных органах, паўсюль у нашым арганізме. Заняткі некаторымі відамі спорту, такімі як гімнастыка, фігурнае катанне, у гнуткіх дзяцей з празмерным аб'ёмам руху ў суставах з'яўляецца фактарам рызыкі павышанай траўматызацыі, спрыяе развіццю набытай гіпермабільнасці, што таксама прыводзіць да мікратраўмаў. Гэта абумовіць захворванне суставаў ужо ў 20-30 гадоў. Вядома, тут існуюць канкрэтныя рэкамендацыі па зніжэнні шкоды — на суставы, якія падвяргаюцца празмернай нагрузцы, трэба надзяваць артэзы, спецыяльныя павязкі, але многія гэта ігнаруюць.

**Ганна БУГЛОВА:**

— Другі фактар — наяўнасць лішняй вагі або атлусцення. У нас з гэтым жывуць каля 30 працэнтаў дарослага насельніцтва. Усе такія людзі — у групе рызыкі па захворванні суставаў ніжніх канечнасцей, якія падвяргаюцца пастаяннай дадатковай нагрузцы, а таму хутчэй зношваюцца. Суставам абсалютна не ўсё роўна — вытрымліваць вагу 65 кг або 95 кг: яны не разлічаны на тое, каб вы штодня насілі з сабой мех бульбы.

Трэці фактар — узроставае зніжэнне гармонаў эстрагенаў. У многіх жанчын першыя клінічныя пашкоджанні суставаў сустракаюцца ў перыяд прэменапаўзы і менапаўзы. Аднак калі раней узрост менапаўзы прыпадаў на 50-52 гады, то сёння гэты працэс назіраецца ў 47-гадовых, а таму мы кажам, што астэаартрыт памаладзеў. Урач-рэўматолаг і гінеколаг павінны вызначыцца з магчымасцю прызначэння жанчыне гарманальнай замяшчальнай тэрапіі. Без паказанняў прымаць гармоны нельга, бо лішак эстрагенаў у арганізме можа справакаваць якое-небудзь іншае захворванне. Звычайна ў здаровых 40-50-гадовых жанчын замяшчальная тэрапія папярэджвае не толькі паталогіі суставаў, але і астэапароз, сардэчна-сасудзістыя захворванні. У старэйшым узросце такая тэрапія не апраўдана з прычыны ўскладненняў. Прыём гармонаў — не панацэя, але рэальная магчымасць выйграць час для таго, каб навучыцца правільна сябе паводзіць.

**Тамара ЦЯБУТ:**

— Чацвёрты фактар — наяўнасць варыкознай хваробы ніжніх канечнасцей, што спрыяе парушэнню кровазабеспячэння тканкі каленных, тазасцегнавых, галёнкаступнёвых суставаў. Відавочна, варыкоз трэба лячыць.

Пяты фактар — наяўнасць плоскаступнёвасці. Яна ўзнікае ў некаторых пацыентаў яшчэ ў дзяцінстве. Да 3 гадоў дзіця павінна насіць толькі абутак з умацаванай пяткай, закрытым носікам, раменьчыкам, які фіксуе галёнкаступнёвы сустаў, аднак у продажы можна ўбачыць і іншыя варыянты. Няправільным вырабам абутку бацькі спрыяюць развіццю плоскаступнёвасці, якая ў далейшым прывядзе да шэрагу праблем з тымі ж суставамі, бо ступня, якая не мае зводаў, перагружае падчас хады і скачкоў суставы, размешчаныя вышэй. Калі такая праблема ёсць, яе нельга ігнараваць — трэба насіць абутак з супінатарамі.

***— Якія метады абследавання вы параіце для ранняга выяўлення захворвання?***

**Алена КУНДАР:**

— Найлепш за ўсё з першым болем, пахрустваннем у суставах спачатку звярнуцца да спецыяліста-рэўматолага. Сёння ў нашай краіне каля сотні такіх урачоў. Можна звярнуцца і да ўчастковага тэрапеўта. Дарэчы, пахрустванне ў каленных і лакцявых суставах падчас нагрузкі можа ні аб чым і не гаварыць. Больш трывожным сімптомам будзе прыпухласць. Калі раніцай вам цяжка зрабіць першыя рухі, вы адчуваеце скаванасць, то не варта цягнуць з візітам да ўрача, паколькі размова ўжо можа ісці аб наяўнасці запаленчага працэсу. Пры неабходнасці ўрач прызначыць рэнтгеналагічнае або ўльтрагукавое даследаванне, якія дазваляюць ацаніць ступень развіцця захворвання. Пры падазрэнні на застарэлую траўму, для выяўлення ўнутраных пашкоджанняў падчас посттраўматычнага астэаартрозу прызначаецца магнітна-рэзанансная тамаграфія.

***— Якім будзе лячэнне?***

**Тамара ЦЯБУТ:**

— Асноўная група прэпаратаў, што працуюць толькі на ранніх стадыях захворвання, — хондрапратэктары, якія яшчэ называюць прэпаратамі павольнага дзеяння для лячэння астэаартрыту. Навуковыя даследаванні паказваюць, што магчымасць аднаўлення структуры пашкоджаных сустаўных тканак існуе толькі на ранніх этапах развіцця захворвання і пры доўгім прыёме (не менш за 3 гады). Здараецца, што пры першых выяўленых парушэннях такія прэпараты прызначаюцца на 3-6 месяцаў двойчы на год, аднак трэба разумець, што ў ідэале пры паказаннях гэта можа быць і даўжэй. Калі мы маем справу з астэаартрытам 3-й або 4-й стадыі, то падобная тэрапія не будзе такой эфектыўнай у сэнсе аднаўлення, яна можа спрыяць толькі змяншэнню болю (на жаль, не ва ўсіх пацыентаў). Гэта таксама важна, паколькі можна будзе не так часта прыбягаць да супрацьзапаленчых нестэроідных прэпаратаў, якія добра купіруюць боль, але маюць пабочныя эфекты.

**Алена КУНДАР:**

— У ліку самых вядомых хондрапратэктараў — «Дона» і «Тэрафлекс», аднак іх значна больш, і ўсё яны змяшчаюць некалькі хімічных рэчываў працяглага дзеяння. Ужыванне таблетак і парашкоў можна чаргаваць з уколамі гіялуронавай кіслаты — непасрэдна ў сустаў 1-2 разы ў год — або ўнутрымышачнымі ін'екцыямі. Але ўсё гэта будзе эфектыўным на 1-й і 2-й стадыях захворвання.

**Ганна БУГЛОВА:**

— Неабходна адзначыць наяўнасць досыць вялікай колькасці айчынных лекавых сродкаў, якія змяшчаюць хандраіцін і глюказамін. Гэта такія прэпараты, як хандрамед, хандрамед плюс, мукасат, глюказамін...

На вялікі жаль, нашы пацыенты не толькі позна звяртаюцца па дапамогу, але і не прыслухоўваюцца да ўрачэбных рэкамендацый, самі адмяняюць прызначанае лячэнне, бо ім здаецца, што цудоўны эфект гарантуецца і пасля адной упакоўкі. На самай справе, боль сапраўды змяншаецца даволі хутка, аднак гэта не азначае, што пачаўся складаны працэс аднаўлення ў структурах нашага сустава.

**Тамара ЦЯБУТ:**

— У апошнія гады з'яўляюцца новыя лекі, якія ўздзейнічаюць на біялагічныя актыўныя рэчывы — цытакіны (яны выклікаюць пашкоджанні сустаўных тканак і запаленне). Сярод такіх лекаў — дыяцэрэін (дыяфлекс), піяскледзін. Існуюць ужо і высокатэхналагічныя метады дапамогі, якія пакуль нельга назваць шырока даступнымі. Наогул, усе нашы органы, у тым ліку злучальная тканка, фарміруюцца з аднолькавых ствалавых клетак. Вучоныя здолелі ператварыць ствалавую клетку, узятую з касцявога мозгу або тлушчавай тканкі, у клетку храстковую, пасля чаго даставіць у храсток, дзе яна расце і закрывае дэфект.

**Ганна БУГЛОВА:**

— У комплексным лячэнні можна прымяняць і фізіятэрапію — для змяншэння болевага сіндрому. Выкарыстоўваюцца ўльтрагук, магніта-, лазера-, гідра-, бальнеа-, гразетэрапія, хоць гэта не панацэя, а менавіта дапаўненне. Прымяняюцца і фітапрэпараты з экстрактаў соі, авакада ■

### ВАЖНАЯ ЧАСТКА ЛЯЧЭННЯ

***Дыета***

• Поўнасцю адмовіцца ад кандытарскіх і каўбасных вырабаў, тлустага мяса, шакаладу, чорнага перцу, яечнага жаўтка, таматаў.

• Істотна абмежаваць цукар, алкаголь, салодкія напоі.

• Ужываць поснае мяса і рыбу, абястлушчаныя малочныя прадукты, кашы, крупы, садавіну, гародніну, у тым ліку спаржу, цыбулю і часнок, чорны хлеб, студзень, заліўное.

***Фізічная актыўнасць***

Лячэбная фізкультура пры астэаартрыце каленнага і тазасцегнавога суставаў праводзіцца толькі ў становішчы лежачы або седзячы.

Працяглая хада і бег на доўгія дыстанцыі, валейбол, футбол і тэніс не рэкамендуюцца.

Паказаны язда на веласіпедзе, плаванне, аквааэробіка, водныя гульні.

### АСТЭААРТРЫТ ЦІ АСТЭААРТРОЗ?

**Па сутнасці, гэта адно і тое ж. Некалі меркавалася, што пры астэаартрыце пакутуе толькі храсток, аднак з развіццём дыягностыкі ўдалося ўстанавіць, што размова ідзе пра хранічнае захворванне суставаў з пашкоджаннем усіх структурных элементаў — субхандральнай косці, храстка, сінавіяльнай абалонкі, звязак, капсулы сустава і навакольных мышцаў. У народзе захворванне часцей называюць проста «артрозам» або «адкладаннем соляў», што не зусім правільна, бо пры астэаартрыце адбываецца не адкладанне соляў у храстку, а парушаецца абмен у касцявой і храстковай тканках. У выніку храсток становіцца менш эластычным, менш гладкім і растрэскваецца. Трэнне сустаўных паверхняў касцей адна аб другую адбываецца не так лёгка, як у здаровага. Акрамя таго, зменены храсток дрэнна абараняе косці ад нагрузкі. Усё гэта прыводзіць да таго, што ў суставе ўзнікае боль, асабліва падчас руху, пасля ў стане спакою, а часам і па начах, паступова ў ім змяншаецца аб'ём руху.**

**Асноўныя сімптомы: боль у суставе, абмежаванне руху, ранішняя скаванасць (працягласцю да 30 хвілін), прыпухласць сустава, пашкоджанне калясустаўных тканак, атрафія («высыханне») калясустаўных мышцаў.**

**Самалячэнне недапушчальна, паколькі існуюць іншыя захворванні суставаў з падобнымі праявамі, але іх лячэнне мае прынцыповыя адрозненні. Акрамя таго, вялікая колькасць рэкламуемых сродкаў не мае дастатковай навуковай базы адносна іх эфектыўнасці. Разабрацца з гэтым дапаможа толькі ўрач.**

■ Доктар адказа

# ДОНАРСТВА ЗДАРОВЫМ НЕ ШКОДЗІЦЬ

**«Раскажыце, калі ласка, як стаць донарам, куды трэба звяртацца? Як донарства ўплывае на здароўе?**

*Валянцін, г. Мінск».*

Тлумачыць **валеолаг 13-й гарадской паліклінікі г. Мінска Людміла СЛЫШКІНА.**

— Донарам у нашай краіне можа стаць як грамадзянін краіны, так і асоба без грамадзянства, якая пастаянна пражывае на тэрыторыі Беларусі, і нават замежнікі ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў. Пры гэтым неабходна быць дзеяздольным, не мець захворванняў і пэўных проціпаказанняў. Аб іх можна даведацца ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій.

Наогул папярэдні запіс ажыццяўляецца ў адзіным донарскім цэнтры па нумарах: 289 84 84, 289 86 43. Пра даты правядзення Дня донара на прадпрыемствах і ва ўстановах можна даведацца па нумары: 289 87 41.

Здаць кроў і яе кампаненты можна таксама ў аддзяленнях пералівання крыві Мінскай абласной клінічнай бальніцы, 5-й, 9-й гарадскіх клінічных бальніцах, гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі г. Мінска, а таксама ў гарадскім цэнтры трансфузіялогіі (вул. Уральская і Ульянаўская).

Падчас рэгістрацыі на дачу крыві спатрэбяцца дакументы: пашпарт; выпіска з медыцынскіх дакументаў аб перанесеных захворваннях, траўмах, аперацыях; вынік флюараграфіі, для жанчын — заключэнне гінеколага; ваенны білет (для ваеннаабавязаных пры першым звароце), фота 3х4.

### АД ДОНАРА ПАТРАБУЕЦЦА:

весці здаровы лад жыцця і вытрымліваць правілы асабістай гігіены;

паведаміць урачу звесткі аб перанесеных захворваннях і выпадковых палавых сувязях, якія могуць пагражаць палавымі інфекцыямі;

не ўжываць спіртныя напоі цягам 3 дзён да моманту дачы;

не з'яўляцца ў выпадку дрэннага самаадчування (насмарк, кашаль, галаўны боль, боль у горле і інш.);

у дзень медабследавання і дачы крыві не ўжываць тлустую ежу і не курыць.

Донарства не шкодзіць арганізму, калі чалавек здаровы.

Стандартны аб'ём нарыхтоўкі крыві (данацыі) — 450 + 50 мл у асоб з вагой не менш за 55 кг — бяспечны для здароўя. Кожная такая страта крыві выклікае зніжэнне ўзроўню гемаглабіну цягам пяці дзён пасля данацыі на 2-10 працэнтаў і колькасці эрытрацытаў з першых гадзін і таксама цягам наступных пяці дзён. Праз 40-50 дзён адбываецца поўнае аднаўленне складу крыві. Эрытрацыты аднаўляюцца за 4-6 тыдняў, лейкацыты і трамбацыты — праз 1 тыдзень, склад плазмы — за 1-2 дні, узровень гемаглабіну — праз месяц.

Для больш хуткага аднаўлення складу крыві рэкамендуецца піць больш сокаў і чаю. У рацыёне донара абавязкова павінны быць мяса, буракі, грэчка, сачавіца, фасоля і ўсе бабовыя, рыба і інш.

Рэакцыя на ўзяцце крыві залежыць ад псіхаэмацыянальнага стану, фізічнай нагрузкі, харчавання, надвор'я і г.д. Адразу пасля дачы можна гаварыць аб стрэсавай сітуацыі. Зніжаецца вянозны і артэрыяльны ціск, паскараецца цёк крыві, пачашчаецца пульс. Аднак праз 30-60 хвілін сардэчна-сасудзістая дзейнасць нармалізуецца — донарам рэкамендуецца ў гэты час адпачынак.

Лічыцца, што ў тых, хто здае кроў рэгулярна, больш шанцаў выжыць у экстрэмальных умовах, пры цяжкіх траўмах, раненнях, апёках. Паводле некаторых звестак, дача крыві нават падаўжае жыццё ў сярэднім на 5 гадоў.

У дзень здачы крыві донар вызваляецца ад працы з захаваннем сярэдняга заробку, таксама яму прадастаўляецца дзень адпачынку, які можна далучыць да працоўнага водпуску. Донарам у Беларусі ўсё яшчэ прадастаўляюцца льготы, аднак у шэрагу краін гэтая справа дабрачынная і бязвыплатная, да чаго варта імкнуцца і беларусам ■

■ Візіт да стаматолага

# ЗУБНАЯ НІТКА: ЯК КАРЫСТАЦЦА?

**Чыстка зубной ніткай выдаляе зубны налёт і часціцы ежы ў такіх участках ротавай поласці, куды зубная шчотка часамне дабярэцца.**

**Карыстацца ёю трэба штодня, іначай назапашванні зубнога налёту прывядуць да карыесу і хваробаў дзяснаў.**

**Аб гэтым папярэджвае ўрач-стаматолаг-тэрапеўт 10-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Кацярына ДЗЯМІДАВА.**

Вазьміце 45 см ніткі, наматайце большую частку вакол сярэдніх пальцаў, пакінуўшы для чысткі 2,5-5 см. Трымаючы зубную нітку паміж вялікімі і ўказальнымі пальцамі, акуратна рухайце яе ўнізуверх паміж зубамі.

Рухайце нітку вакол асновы кожнага зуба, ніколі не цягніце яе з сілай, паколькі гэта можа пашкодзіць тонкую тканку дзяснаў.

Ад зуба да зуба выкарыстоўвайце чысты ўчастак зубной ніткі.

Зубныя ніткі бываюць з нейлону і тэфлону. У першым выпадку гэта мноства нейлонавых валокнаў, а таму нітка падчас чысткі можа развалокнівацца, што падабаецца далёка не ўсім. Мананітка з тэфлону даражэйшая, затое лёгка рухаецца нават у самых шчыльных прамежках і не варсуецца. Наогул, абодва тыпы добра выдаляюць рэшткі ежы і налёт ■

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

ПЕРШАЯ ДАПАМОГА

# КАЛІ ГЭТА ГІПЕРТАНІЧНЫ КРЫЗ

**Размова ідзе пра раптоўнае павышэнне артэрыяльнага ціску, якое праяўляецца слабасцю, моцным галаўным болем, млосцю, ванітамі, галавакружэннем, сэрцабіццём, болем у сэрцы, пагаршэннем зроку. Калі артэрыяльны ціск узнімаецца вышэй за 160/100 мм рт. сл., ён дасягае ўмоўнай мяжы паміж гіпертанічнай хваробай і гіпертанічным крызам. Як правіла, дыясталічны ціск (другая лічба) перавышае 120. Гэта могуць быць лічбы 200-260/120-140 мм рт. сл. і нават вышэй.**



**Што адбываецца падчас гіпертанічнага крызу?** Ён раптоўна пачынаецца і доўжыцца ад некалькіх хвілін да 1-3 гадзін. Узровень артэрыяльнага ціску індывідуальна высокі (у аднаго пацыента гэта 240/120, у іншага — 130/90). Калі ў пацыента пастаянна нізкі ўзровень ціску, то нават нязначнае яго павышэнне можа выклікаць гіпертанічны крыз. Могуць быць скаргі на боль у сэрцы, сэрцабіццё, галаўны боль, галавакружэнне, парушэнне зроку, дрыжанне, патлівасць, адчуванне прыліву крыві да галавы, недахоп паветра і інш.

**Што можа прывесці?**

• Псіхаэмацыянальныя стрэсавыя сітуацыі.
• Празмернае ўжыванне солі.
• Змены надвор'я і атмасфернага ціску.
• Інтэнсіўнае курэнне.
• Ужыванне алкаголю.
• Празмерная ежа, асабліва салёная і на ноч.
• Раптоўнае спыненне працяглага ўжывання прэпаратаў для зніжэння артэрыяльнага ціску.
• Інфекцыі (падчас эпідэмій грыпу частата гіпертанічных крызаў узрастае).

**Чым небяспечны?** Гіпертанічны крыз — гэта не проста раптоўнае рэзкае павышэнне артэрыяльнага ціску, які суправаджаецца галаўным болем. Такі стан можа прывесці да розных ускладненняў — парушэнняў з боку цэнтральнай нервовай сістэмы (памутненне свядомасці або кома), кровазліцця ў галаўны мозг, сардэчнай недастатковасці, ацёку лёгкіх, стэнакардыі, інфаркту міякарда.

**Загадчыца раённага кардыялагічнага цэнтра 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Людміла ПАПОВА** расказвае, што рабіць падчас гіпертанічнага крызу, як дапамагчы сабе або блізкаму чалавеку.

**1.** Вазьміце пад язык, разжуйце і рассмакчыце да поўнага растварэння прэпарат хуткага дзеяння каптапрыл (25-50 мг).

**2.** Пажадана прылегчы або прыняць зручную паставу.

**3.** Праз 30 хвілін паўторна памерайце артэрыяльны ціск. Калі змяненняў няма, паўтарыце прыём каптапрылу.

**4.** Калі артэрыяльны ціск знізіўся на 20 мм рт. сл. і больш, працягвайце (або аднавіце) прызначаную ўрачом гіпатэнзіўную тэрапію.

**5.** Ціск трэба зніжаць паступова цягам 1 гадзіны.

Калі пад'ём ціску празмерны (звыш 200/100 мм рт. сл.) або суправаджаецца болем за грудзінай, узмацненнем галаўнога болю, слабасцю ў канечнасцях, парушэннем маўлення — тэрмінова выклікайце ўрача.

**Каб не дапусціць паўторнага гіпертанічнага крызу, неабходна:**

рэгулярна мераць артэрыяльны ціск; прымаць гіпатэнзіўныя сродкі, прызначаныя ўрачом; вытрымліваць усе рэкамендацыі ўрача па харчаванні, штодзённай фізічнай актыўнасці, рэжыме працы і адпачынку; пазбягаць ужывання алкаголю і не курыць; дабівацца зніжэння ўзроўню стрэсу з дапамогай рэлаксацыйнай дыхальнай гімнастыкі, аўтагеннай трэніроўкі; заўсёды мець пры сабе прэпарат хуткага дзеяння (каптапрыл).

# КАЛІ ГЭТА САРДЭЧНЫ ПРЫСТУП

**Сардэчны прыступ — гэта сур'ёзнае парушэнне або нават спыненне кровазвароту сардэчнай мышцы, што можа прывесці да інфаркту міякарда. Прыводзіць да гэтага раптоўная закупорка тромбам прасвету сардэчнай артэрыі або працяглы спазм у месцы атэрасклератычнай бляшкі.**



**Што адбываецца падчас прыступу?** Хворы адчувае моцны боль у сэрцы, ён можа аддаваць у левае плячо, руку, шыю, ніжнюю сківіцу; часам можа быць толькі цяжар і дыскамфорт за грудзінай, ля горла; недахоп паветра, страх смерці, халодны пот. Прыступ можа быць зусім кароткім, а можа быць і працяглым.

З'яўленне падобных сімптомаў патрабуе тэрміновага звароту па медыцынскую дапамогу.

**Загадчыца раённага кардыялагічнага цэнтра 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Людміла ПАПОВА** нагадвае, што зрабіць да прыезду «хуткай».

**1.** Пакласці хворага з прыўзнятай галавой, расшпіліць цеснае адзенне, забяспечыць прыток свежага паветра, супакоіць.

**2.** Даць нітрагліцэрын — пад язык (да трох таблетак з інтэрвалам 5-6 хвілін), хоць падчас інфаркту цалкам гэты прэпарат ад болю не пазбаўляе, а валідол і ўвогуле неэфектыўны ў такім выпадку.

**3.** Адначасова трэба разжаваць і праглынуць адну таблетку аспірыну (ацэтылсаліцылавай кіслаты) у дозе 0,5 мг.

**4.** Палёгку могуць прынесці і сродкі, якія адцягваюць увагу: гарчычнікі на вобласць сэрца і грудзіну, грэлка да ног, саграванне рук.

Шпіталізаваць такога хворага павінна толькі брыгада хуткай дапамогі!

Нітрагліцэрын і аспірын павінны быць у кожнай аптэчцы. Кожны дарослы павінен ведаць алгарытм іх прымянення падчас сардэчнага прыступу. Трэба таксама ведаць, што прымаць нітрагліцэрын нельга пры падазрэнні на парушэнне мазгавога кровазвароту (калі ёсць вострае парушэнне зроку, маўлення, каардынацыі руху).

# КАЛІ ГЭТА ЭПІЛЕПСІЯ

**Калі на вашых вачах у чалавека здарыўся прыступ эпілепсіі, не бойцеся падысці да хворага. Вы не спыніце прыпадак, але можаце засцерагчы хворага ад пашкоджанняў.**

**Што адбываецца з чалавекам падчас прыступу?** Раптоўна хворы падае на спіну або тварам уніз, ён страчвае прытомнасць, пачынаюцца сутаргі, з рота з'яўляецца пена (можа быць з кроўю, калі хворы прыкусіць язык), галава моцна ўздрыгвае, мышцы тулава, рук і ног уздрыгваюць хвалямі. Прыступ доўжыцца літаральна 1-2 хвіліны, пасля чаго хворы яшчэ можа знаходзіцца ў бессвядомым стане.

**Намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Галіна КРАЎЧУК** тлумачыць, што неабходна рабіць.

**1.** Абараніць галаву ад паўторных удараў — падкласці што-небудзь, каб змякчыць удары.

**2.** Пакласці хворага на бок.

**3.** Расшпіліць цеснае адзенне.

**4.** Падтрымаць, каб прадухіліць траўмы.

**5.** Не стрымліваць сутаргі сілай.

**6.** Абавязкова выклікаць «хуткую дапамогу» (па завяршэнні прыступу хворы можна знаходзіцца ў стане дэзарыентацыі, яму патрэбны час для аднаўлення).



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| Продавец | **ОАО «Шкловский агросервис»,** Могилевская обл., г. Шклов, ул. Колхозная, 56 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Здание арочника | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 721,5 | 725/С-16546 | Могилевская обл., Шкловский р-н, г. Шклов, ул. Колхозная, 62Б |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности:** | два забора, ворота, калитка |
| **Сведения о земельном участке:** | Площадь 0,6378 га. Предоставлен продавцу на праве аренды по 17.12.2063 для строительства и обслуживания арочника с установленными ограничениями: водоохранная зона водных объектов, площадь 0,6378 га |

**Начальная цена с НДС 20% – 349 854 808 белорусских рублей.**

**Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15 рабочих дней после проведения аукциона.** |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.05.2015 г.*

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.07.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **24.07.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

## РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Счастливая покупка №2»

**Сведения об организаторе:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «КонтеТрейд», УНП 590701005, г. Гродно, ул. Победы, 30.

**Наименование рекламной игры:** «Счастливая покупка №2».

**Территория проведения игры:** Республика Беларусь.

**Срок начала и окончания рекламной игры:** 23 марта 2015 – 24 июля 2015.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2520 выдано Министерством торговли Республики Беларусь 4 марта 2015 г. Правила рекламной игры «Счастливая покупка №2» были опубликованы в газете «Звязда» №154(24535) от 12.03.2015.

**Сведения о количестве участников рекламной игры:** в рекламной игре участвовало 21754 человека. Общее количество писем, участвовавших в рекламной игре, составило 59467 писем.

**Сведения о розыгрыше призового фонда:** Призовой фонд, общий размер которого составляет 600 000 000 (шестьсот миллионов) белорусских рублей, разыгран полностью.

**Ф.И.О. победителей рекламной игры, их выигрыш:** Список победителей рекламной игры (с указанием выигранного приза) размещен на сайте www.HappyBy.com

**Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры:** +375333777897, +375445040777.

БЕЛАРУСБАНК

## ВНИМАНИЮ ДЕРЖАТЕЛЕЙ КАРТОЧЕК ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК»!

С 15 июля 2015 года изменяются размеры вознаграждений по операциям с использованием карточек банка.

**1. С 15.07.2015 по 30.09.2015 снижены** размеры вознаграждений за обслуживание международных карточек:

| Виды карточек | Наименование операции | Размер вознаграждения: Счет в долларах США, евро | Счет в российских рублях | Счет в белорусских рублях |
|---|---|---|---|---|
| MasterCard Gold, Visa Gold | Обслуживание основной карточки (срок действия 1 год): | | | |
| | - за первый год обслуживания | 22 единицы валюты | 1 200 рос. руб. | 340 000 бел. руб. |
| | - за второй год обслуживания | 21 единица валюты | 1 150 рос. руб. | 320 000 бел. руб. |
| | - за третий и каждый последующий год обслуживания | 20 единиц валюты | 1 050 рос. руб. | 300 000 бел. руб. |
| | Обслуживание дополнительной карточки (срок действия 1 год) | 20 единиц валюты | 1 050 рос. руб. | 300 000 бел. руб. |
| | Обслуживание основной карточки (срок действия 2 года): | | | |
| | - за первые два года обслуживания | 35 единиц валюты | 1 900 рос. руб. | 540 000 бел. руб. |
| | - за каждые последующие два года | 30 единиц валюты | 1 600 рос. руб. | 460 000 бел. руб. |
| | Обслуживание дополнительной карточки (срок действия 2 года) | 25 единиц валюты | 1 350 рос. руб. | 380 000 бел. руб. |
| MasterCard Standard, Visa Classic | Обслуживание основной карточки (срок действия 1 год): | | | |
| | - за первый год обслуживания | 10 единиц валюты | 540 рос. руб. | 150 000 бел. руб. |
| | - за второй год обслуживания | 8 единиц валюты | 450 рос. руб. | 130 000 бел. руб. |
| | - за третий и каждый последующий год обслуживания | 7 единиц валюты | 400 рос. руб. | 115 000 бел. руб. |
| | Обслуживание дополнительной карточки (срок действия 1 год) | 7 единиц валюты | 400 рос. руб. | 115 000 бел. руб. |
| | Обслуживание основной карточки (срок действия 2 года): | | | |
| | - за первые два года обслуживания | 15 единиц валюты | 800 рос. руб. | 230 000 бел. руб. |
| | - за каждые последующие два года | 12 единиц валюты | 670 рос. руб. | 190 000 бел. руб. |
| | Обслуживание дополнительной карточки (срок действия 2 года) | 10 единиц валюты | 540 рос. руб. | 150 000 бел. руб. |
| Пакет услуг «Престиж» | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя основной международной **бесконтактной карточки MasterCard Gold** (срок действия 3 года): | | | |
| | - за первые три года обслуживания | 40 единиц валюты | 2 160 рос. руб. | 610 000 бел. руб. |
| | - за каждые последующие три года обслуживания | 30 единиц валюты | 1 620 рос. руб. | 460 000 бел. руб. |
| | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя дополнительной международной **бесконтактной карточки MasterCard Gold** (срок действия 35 месяцев) | 22 единицы валюты | 1 190 рос. руб. | 340 000 бел. руб. |
| Пакет услуг «Престиж плюс» | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя основной международной **бесконтактной карточки MasterCard Gold** (срок действия 5 лет): | | | |
| | - за первые 5 лет обслуживания | - | - | 400 000 бел. руб. |
| | - за каждые последующие пять лет обслуживания | - | - | 300 000 бел. руб. |
| | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя дополнительной международной **бесконтактной карточки MasterCard Gold** (срок действия 35 месяцев) | - | - | 220 000 бел. руб. |
| Пакет услуг «Платинум» | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя основной **международной карточки Visa Platinum** (срок действия 1 год) | 100 единиц валюты | 5 400 рос. руб. | 1 500 000 бел. руб. |
| | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя дополнительной международной карточки **Visa Platinum** (срок действия 35 месяцев) | 90 единиц валюты | 4 870 рос. руб. | 1 380 000 бел. руб. |

**2. Изменены размеры** вознаграждений за обслуживание карточек:

| Виды карточек | Наименование операции | Размер вознаграждения: Счет в долларах США, евро | Счет в российских рублях | Счет в белорусских рублях |
|---|---|---|---|---|
| БЕЛКАРТ-Maestro, Visa Electron, Visa Electron «Леди Карт» | Обслуживание основной карточки (срок действия 3 года) | - | - | 90 000 бел. руб. |
| | Обслуживание дополнительной карточки (срок действия 35 месяцев) | | | 60 000 бел. руб. |
| Visa Electron «Сберегательная» | Обслуживание основной карточки (срок действия 3 года) | 10 единиц валюты | 540 рос. руб. | - |
| | Обслуживание дополнительной карточки (срок действия 35 месяцев) | 5 единиц валюты | 270 рос. руб. | - |
| Maestro, Visa Electron | Обслуживание основной карточки (срок действия 1 год): | | | |
| | - за первый год обслуживания | 5 единиц валюты | 270 рос. руб. | 75 000 бел. руб. |
| | - за второй год обслуживания | 4 единицы валюты | 210 рос. руб. | 60 000 бел. руб. |
| | - за третий и каждый последующий год обслуживания | 3 единицы валюты | 160 рос. руб. | 45 000 бел. руб. |
| | Обслуживание дополнительной карточки (срок действия 1 год) | 3 единицы валюты | 160 рос. руб. | 45 000 бел. руб. |
| Пакет услуг «Современный» | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя основной **международной бесконтактной карточки Visa Electron** (срок действия 3 года) | 10 единиц валюты | 540 рос. руб. | 150 000 бел. руб. |
| | Обслуживание в рамках пакета услуг держателя дополнительной международной **бесконтактной карточки Visa Electron** (срок действия 35 месяцев) | 8 единиц валюты | 430 рос.руб. | 120 000 бел. руб. |

**3. Изменены** размеры вознаграждений по следующим операциям:

| Наименование операций | Размер вознаграждения: Счет в белорусских рублях | Счет в долларах США, евро | Счет в российских рублях |
|---|---|---|---|
| Срочное оформление (перевыпуск, обновление, изготовление дубликата) дебетовой карточки (на следующий рабочий день после подачи заявления) клиентам учреждений банка, расположенных в г. Минске | 200 000 бел. руб. | 13 единиц валюты | 700 рос. руб. |
| **Перевыпуск карточки в случае ее утери (хищения), изготовление дубликата карточки:** | | | |
| международные карточки БЕЛКАРТ-Maestro, Maestro, Visa Electron | 75 000 бел. руб. | 5 единиц валюты | 270 рос. руб. |
| международные карточки MasterCard (Gold, Standard, Business), Visa (Gold, Classic, Business) | 150 000 бел. руб. | 10 единиц валюты | 540 рос. руб. |
| международные карточки MasterCard World Black Edition, Visa Platinum | 920 000 бел. руб. | 60 единиц валюты | 3 250 рос. руб. |
| **Блокировка карточки банком (нахождение карточки в стоп-листе):** | | | |
| международные карточки БЕЛКАРТ-Maestro, Maestro, Visa Electron | 75 000 бел. руб. | 5 единиц валюты | 270 рос. руб. |
| международные карточки MasterCard (World Black Edition, Gold, Standard, Business), Visa (Platinum, Gold, Classic, Business) | 680 000 бел. руб. | 45 единиц валюты | 2 430 рос. руб. |
| **Представление в учреждении банка выписки по счету, счету предоплаченной карточки (за исключением выписки за текущий и (или) предыдущий месяц) на бумажном носителе** | 45 000 бел. руб. | 3 единицы валюты | 160 рос. руб. |
| **Выяснение в платежной системе правильности списания средств со счета (счета кредитополучателя), за исключением случаев мошеннических операций** | 680 000 бел. руб. | 45 единиц валюты | 2 430 рос. руб. |
| **Ежемесячная плата за пользование услугой «SMS-оповещение» на одну дебетовую карточку (за каждый номер телефона):** | | | |
| SMS-оповещение о расходных или приходных операциях (по выбору клиента) | 15 000 бел. руб. | 1 единица валюты | 55 рос. руб. |
| SMS-оповещение о расходных и приходных операциях | 20 000 бел. руб. | 1,5 единицы валюты | 80 рос. руб. |
| Предоставление в банкоматах, инфокиосках банка, посредством системы Интернет-банкинг мини-выписки об операциях, совершенных с использованием карточки или ее реквизитов (содержит 10 последних операций за 7 последних дней), оформленной к счету в долларах США либо евро | 0,2 единицы валюты | | |
| | Счет в долларах США, евро | | |
| **Снятие наличных денежных средств с использованием карточки** | | | |
| в других банках (без учета вознаграждения других банков) | 3% от суммы (мин. 6 единиц валюты) | | |
| в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков) | 2% от суммы (мин. 3 единицы валюты) | | |

За единицу валюты принимается единица валюты счета, к которому оформлена платежная карточка.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Извещение о проведении открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность
**Организатор аукционов:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221281601601000179, площадью 0,0758 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вымнянский с/с, аг. Вымно, ул. Витебская (между домами №6 и №12) для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (озеро Вымно), охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 10 328 950 бел. руб. **Размер задатка:** 1 032 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 18.08.2015 в 16.00. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 15.07.2015 с 8.30 по 17.08.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** получить тех.документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем.участка не позднее 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации права на него; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314030059 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300976329, код платежа 4901, получатель платежа: Вымнянский сельисполком. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221882201901000046, площадью 0,1496 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Большое Лосвидо, ул. Центральная, 22А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (озеро Лосвидо). **Начальная цена**: 12 489 200 бел. руб. **Размер задатка:** 1 248 000 бел. руб. |
| Лот №2. . Земельный участок с кадастровым №221882201901000047, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Большое Лосвидо, ул. Центральная, 22Б для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (озеро Лосвидо); охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 12 522 600 бел. руб. **Размер задатка:** 1 252 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 19.08.2015 в 15.00 по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, в Городокском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 15.07.2015 с 8.30 по 18.08.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** получить разрешение на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца; в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600316027002 в ЦБУ № 207 филиала № 200 Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300066953, код платежа: 4901, получатель платежа: Вайханский сельисполком. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос.регистрацией права на зем.участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем.участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем.участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос.регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона - участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

**сообщает о проведении внеочередного собрания акционеров, которое состоится 31 июля 2015 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О выплате дивидендов по результатам 1-го полугодия 2015 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 31.07.2015 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 14.07.2015 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию с 24 июля 2015 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 29.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-87 – Отдел правовой и кадровой работы, Наблюдательный совет.

УНН 700049607

■ На кантролі

# ПАДАТКІ НЕЛЕГАЛАЎ — У 5-РАЗОВЫМ ПАМЕРЫ

**Незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць у Бабруйску па рамонце аўтамабіляў грамадзянінам Расіі прадухілілі мясцовыя падаткавікі.**

У гэтым выпадку аператыўнікі скарысталіся аб'явай, размешчанай у інтэрнэце, і выехалі на праверку легальнасці прапанаваных паслуг па зварцы, афарбоўцы і паліроўцы машын. Падчас кантрольнай закупкі за паслугі па паліроўцы мужчына папрасіў аванс у 500 тысяч рублёў. Афіцыйна беспрацоўнага расіяніна спецыялісты падатковай службы папярэдзілі і прад'явілі адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў у 5-разовым памеры ў суме 6,9 млн рублёў.

Падобным чынам у ранг нелегалаў трапіў і жыхар Магілёва, які прапанаваў свае паслугі па вырабе мэблі. У выніку кантрольнай закупкі малады чалавек прыняў заказ на выраб і ўстаноўку шафы-купэ, а таксама передаплату ў суме 3 млн рублёў. Яму таксама налічылі падатковы збор у павялічаным памеры, які склаў 7,1 млн рублёў.

**Сяргей ПАЛІНІН**

белагропромбанк
традиции будущего

# БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2015 г.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 1 203 697 | 867 741 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 4 759 | 7 254 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 6 043 824 | 4 460 918 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 694 985 | 1 687 921 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 12 733 606 | 10 218 300 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 61 039 715 | 49 915 004 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 6 462 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 929 082 | 788 289 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 2 422 781 | 2 364 737 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 646 | 247 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 1 098 082 | 541 780 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 86 177 639 | 70 852 191 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 4 038 900 | 3 332 505 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 10 453 865 | 8 333 128 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 53 236 095 | 41 818 922 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 6 581 283 | 5 652 292 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 936 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 11 | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 315 538 | 403 780 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 74 625 692 | 59 541 563 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 6 803 635 | 6 803 635 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 980 000 | 934 879 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 1 205 319 | 1 413 121 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 2 562 993 | 2 158 993 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 11 551 947 | 11 310 628 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 86 177 639 | 70 852 191 |

# ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – июнь 2015 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 5 595 737 | 4 699 920 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 4 876 464 | 3 667 513 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 719 273 | 1 032 407 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 562 424 | 517 985 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 118 437 | 106 697 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 443 987 | 411 288 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 854 | 146 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (21 228) | (6 095) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 235 328 | 238 278 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 78 180 | (1 634) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 349 903 | 187 030 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 451 735 | 432 990 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 1 011 576 | 985 935 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 134 395 | 128 439 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 412 255 | 805 976 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 104 773 | 138 918 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 307 482 | 667 058 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

Председатель Правления А.А.Лысюк

Главный бухгалтер М.А.Шаповалова

Дата подписания «8» июля 2015 г.

**Финансовая отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка: http://www.belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/individualnaya-otchetnost-po-nacionalnym-standartam/quarterly-reporting/date_july/**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» ОКАЗЫВАЕТ УСЛУГИ ПО:**
• оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
• организации и проведению аукционных торгов
• инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 14 августа 2015 г. в 11.30 состоятся открытые аукционные торги по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе Лота № 1 (предмет торгов):**

| | |
|---|---|
| **Наименование и адрес предмета торгов (Лот № 1):** | Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-15120 (квартира № 313) общ. пл. 111,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 41 |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Начальная цена продажи** | 1 068 482 406 рублей, размер задатка – 10%, что составляет 106 848 241 рубль |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369 |
| **Характеристика текущего состояния предмета торгов** | Квартира находится в кирпичном многоквартирном доме с электроснабжением, централизованным отоплением, газоснабжением, холодным и горячим водоснабжением, канализацией, год постр. – 1983. Кол-во комн. – 3, этаж расположения 9-10, площадь кухни (столовой) – 37,1 кв.м, санузел совм., высота потолков – 2,47, в стадии ремонта. В квартире перепланировка не оформлена в установленном законодательством порядке. До перепланировки общая площадь квартиры составляла 99,6 кв.м, кол. комн. – 4. |
| **Условия продажи** | Проведение победителем аукционных торгов работ по восстановлению перепланировки и переустройства в части изоляции отапливаемого помещения квартиры от летнего помещения лоджии и переноса сетей отопления |
| **Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество** | В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | по 10 августа 2015 г. включительно до 16.00 |

**Для участия в торгах в адрес Организатора торгов необходимо предоставить**: заявление на участие в торгах; документ с отметкой банка, подтверждающий о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет; паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;
**Резидентам Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям** – свидетельство о государственной регистрации; **юридическим лицам** – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации); **представителю физического лица и индивидуального предпринимател**я – нотариально заверенную доверенность;
**Нерезидентам Республики Беларусь:** иностранным юридическим лицам, иными организациям – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; индивидуальным предпринимателям – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителю иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иностранной организации – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык.
**Порядок проведения торгов**: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов (Претендентом на покупку) будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов**. Организатор торгов (по письменному указанию соответствующей комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства) вправе снять предмет торгов с торгов в любое время до объявления его проданным.

**Победитель (Претендент на покупку**) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» ОКАЗЫВАЕТ УСЛУГИ ПО:**
• оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
• организации и проведению аукционных торгов
• инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 29 июля 2015 г. в 11.00 состоится ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже недвижимого имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе: Лота № 1 (предмет торгов): Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 730/U-15754 (здание административно-хозяйственного назначения), общей площадью 7458,0 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369, ОКПО 55484006) |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217, Минское шоссе, 213824, г. Бобруйск, Могилевская область |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Начальная цена продажи, рублей без НДС** | 1 (Одна) базовая величина, определенная законодательством, задаток – в размере **одной базовой величины**, определенной законодательством |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок, расп. по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1, общ. пл. – 0,3488 га, состоит: участок № 1 с кадастр. номером 724050100001005539 пл. – 0,3478 га, участок № 2 с кадастр. ном. 724050100001005540 пл. – 0,0005 га, участок № 3 с кадастр. номером 724050100001005541 пл. – 0,0005 га, правовой режим – право постоянного пользования, правообладатель – ОАО «Белшина». |

**Характеристика предмета торгов**

здание административно-хозяйственное – стены ж/б плиты, частич. кирпич, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, крыша совмещ. рулонная, полы бетон., степень гот. – 93%; санитарно-техн. устройства: отопление – стал. трубы. част. пластинчатые батареи, степень гот. – 30%; водопровод – част. стал. трубы, степень гот. – 30%; канализация – част.чугун. трубы, степень гот. – 30%, электроосвещение – част. скрытая проводка, степень гот. – 50%, крыльцо – ж/б перекрытие на метал. опорах

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20% |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | Определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | По 24 июля 2015 г. включительно до 16.00 |

**Победитель (претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 20 июня 2014 г.

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.00.**

■ Хочаце — верце...




# ЧАМУ НЕЛЬГА ЕСЦІ З НАЖА

## І іншыя распаўсюджаныя забабоны

**Вы ніколі не задумваліся пра тое, наколькі важную ролю ў нашым жыцці адыгрываюць забабоны? Усё пачынаецца яшчэ з дзяцінства, калі чорныя кошкі, часцяком з падачы бабуль, здаюцца сапраўднымі істотамі з пекла, пастаянна перабягаюць нам дарогу, а суседка з пустым вядром аўтаматычна становіцца ведзьмай, сустрэча з якой не абяцае нічога добрага. А хто не клаў у чаравік пятак з марным спадзяваннем атрымаць пяцёрку за кантрольную? Пасталеўшы, мы, нават не верачы ў прыкметы, усё роўна не пачынаем важных спраў з панядзелка і ўжо тым больш не адзначаем сорак гадоў. Бо прыкмета. Дрэнная.**

**Асабліва шмат прыкмет, якія, на першы погляд, беспадстаўна забараняюць нейкія дзеянні. Дык давайце ж разбяромся, адкуль да нас прыйшлі ўсе гэтыя дзіўныя і часцяком недарэчныя забабоны? Чаму нельга...**

### ...перадаваць што-небудзь праз парог?

Скажыце, ну хіба вам не знаёмы людзі, якія ніколі не вітаюцца і, тым больш, не перадаюць нічога праз парог? Як думаеце, адкуль узяліся гэтыя дзіўныя забабоны?

Уся справа ў тым, што ў старажытныя часы прах продкаў захоўваўся пад парогам хаты і трывожыць іх, перадаючы штосьці праз парог, лічылася вельмі небяспечным. Менавіта таму нельга было і сядзець на парозе, які да гэтага часу лічыцца мяжой паміж двума светамі — бяспечным домам і варожым светам, ці таго страшней — светам жывых і светам памерлых.

### ...вяртацца з паўдарогі?

Такія забабоны гэтак жа звязаны з парогам і менавіта з яго функцыяй мяжы паміж светамі. Не дасягнуўшы мэты, чалавек вяртаецца дадому аслаблены, і менавіта на парозе-мяжы яго можа чакаць што заўгодна — ад абражаных залішнім непакоем духаў продкаў да істот, якія мараць трапіць у наш свет. Каб нейтралізаваць няўдачы, прыцягнутыя вяртаннем, зноў сыходзячы, варта паглядзець у люстэрка, якое здольна падвойваць сілы і энергію чалавека.

### ...дарыць гадзіннік?

Нават цяпер, у наш адукаваны век, такі падарунак, як гадзіннік, лічыцца непажаданым. Чаму ж? Павер'е гэтае прыйшло да нас з Кітая, дзе ўпэўнены: атрыманы ў падарунак гадзіннік лічыцца запрашэннем на пахаванне. У нас жа вераць, што падораны гадзіннік будзе адлічваць тэрмін сяброўства з чалавекам, а то і лічыць час пакінутага яму жыцця. Акрамя таго, стрэлкі гадзінніка з'яўляюцца вострымі прадметамі, якія, разам з колючымі, дарыць вельмі не рэкамендуецца, каб пазбегнуць сварак і ўзаемных крыўд. Каб нейтралізаваць разбуральнае дзеянне гадзінніка, трэба папрасіць за яго манетку — тады будзе лічыцца, што гадзіннік вы не падарылі, а прадалі.

### ...святкаваць сорак гадоў?

Сорак гадоў — адзіны юбілей, які не прынята святкаваць, тым больш для мужчын. У аснове гэтай традыцыі ляжыць уяўленне аб сувязі лічэбніка «сорак» са смерцю. Як мяркуецца, гэта звязана з тым, што яшчэ ў Кіеўскай Русі было прынята «правяраць памерлых» на нятленнасць і ў XVII стагоддзі тэрмін, па якім тая вызначалася, быў устаноўлены ў 40 дзён. Таму лічба «сорак» наўпрост звязвалася з пахаваннем. Тым больш яна так «сугучна» з памінальным, саракавым, днём пасля смерці, ды і наогул, ва ўсіх рэлігіях лічыцца фатальнай. Адпаведна, той, хто святкуе саракагоддзе, не праяўляе належнай павагі ні да памерлых, ні да самой смерці, а значыць, можа наклікаць на сябе хваробы, няўдачы, а то і гібель.

### ...адразу выходзіць з дому?

Гэтая прымета заснавана на даўняй веры людзей у добрых і злых духаў, якія кіруюць светам. Лічылася, што хатнія духі чапляюцца да чалавека, замінаючы яму ў дарозе і спрабуючы вярнуць назад, а значыць, добрай дарогі не будзе. Прысеўшы перад доўгай дарогай, духаў можна падмануць: яны падумаюць, быццам ніхто нікуды ўжо не едзе і страцяць пільнасць. Тады выправіцца ў шлях можна будзе без лішняга «багажу». Дарэчы, гэтая прыкмета пераклікаецца з забаронай на вяртанне з паловы дарогі. Духі могуць раззлавацца на тое, што іх падманулі, і прынесці яшчэ больш непрыемнасцей у дарозе.

Але ў гэтай прыкметы ёсць і практычнае тлумачэнне — перад далёкай дарогай заўсёды карысна прысесці, прывесці ў парадак думкі і яшчэ раз усё абдумаць.

### ...есці з нажа?

Кажуць, калі есці з нажа, станеш злым. Чаму так? Уся справа ў тым, што такі звыклы нам нож мае старажытную і багатую гісторыю. Нож — адна з першых і галоўных прылад абароны і здабычы ежы чалавека, а значыць, з самага пачатку ён быў не проста кавалкам металу, а прадметам, які мае сакральнае значэнне. Нож лічыўся не толькі прыладай працы, але і прыладай абароны — як ад рэальнай небяспекі, так і ад усялякай нечысці. Такі важны магічны прадмет патрабаваў да сябе адмысловага стаўлення і выкарыстоўваўся толькі пасля правядзення спецыяльных рытуалаў. Есці з яго азначала гнявіць духаў, якія і робяць чалавека злым і агрэсіўным.

Акрамя таго, што такім чынам можна банальна парэзацца.

### ...нічога падбіраць на скрыжаванні?

Скрыжаванне заўсёды лічылася месцам містычным, дзе ў прамым сэнсе перасякаюцца светы — наш і нябачны. На скрыжаваннях праводзіцца велізарная колькасць рытуалаў, якія не заўсёды накіраваны на дабро і справядлівасць. Многія людзі, праходзячы праз скрыжаванне, кажуць, быццам адчуваюць там незразумелы непакой. Цалкам верагодна, што ў дзеянне ўступае сіла самаўнушэння, а можа, і не...

Лічыцца, быццам калі «перавесці» хваробу або няшчасце на якую-небудзь рэч і выкінуць яе на скрыжаванні, яе забярэ нечысць. Менавіта для таго, каб не забраць сабе чужыя непрыемнасці, і не варта нічога падбіраць на скрыжаванні, бо чым даражэйшая знойдзеная там рэч, тым больш сур'ёзная будзе бяда ці хвароба, зведзеная на яе.

### ...хадзіць у адным чаравіку?

Дадзеную прымету выконвалі ва ўсе часы. Старыя людзі кажуць, што калі чалавек дазваляе сабе хадзіць у адным чаравіку або ў адным тапку, то ён вельмі рана становіцца сіратой. Яшчэ ў Бібліі сказана: «Каждой твари по паре». Абутак заўсёды сімвалізаваў яднанне. Два чаравікі — гэта пара. Калі раз'яднаць пару абутку, вы раз'ядноўваеце тых, хто даў вам жыццё, а гэта вашы бацькі. Паўбяды, калі ў вашых бацькоў не склалася сумеснае жыццё і яны проста разыдуцца. А калі ў сям'і сапраўднае каханне, то, акрамя смерці, нічога не зможа раз'яднаць тых, хто кахае.

### ...выносіць смецце пасля заходу сонца?

Гэта, напэўна, самая папулярная ў мужчын прыкмета :) У прынцыпе, яе ведае кожны, але вось не ўсім вядомы яе карані. Па-першае, лічыцца, што, калі вынесці смецце пасля заходу сонца, пра вас будуць хадзіць плёткі. Гэта нядзіўна — з якой радасці выносіць з хаты нешта пад покрывам цемры? Бо суседзі не спяць і захочуць абмеркаваць, чаму ж вы так хаваеце сваё смецце. Яшчэ кажуць, быццам, выносячы смецце ноччу, вы выносіце з хаты грошы, але гэта лагічнаму тлумачэнню не паддаецца абсалютна. Яшчэ адно тлумачэнне звязана з верай зноў жа ў добрых і злых духаў. Для таго, каб добрыя духі ўвайшлі на ноч у дом (натуральна, каб абараніць дамачадцаў ад духаў злых), трэба падрыхтавацца да іх візіту і вынесці з хаты ўсё смецце. Хто не паспеў, той спазніўся, і сэнсу ў вынасе смецця на ноч, адпаведна, няма ■

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарошчая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Ліпень у садзе і агародзе



**Гэты месяц называюць «верхавінай лета». Часам стаяць па-сапраўднаму летнія — цёплыя і сонечныя — дзянькі, а часам надвор'е зусім не песціць, але ў дачнікаў заўсёды гарачая пара.**

### АГАРОДНЫ КЛОПАТ

Ліпень лічыцца самым гарачым месяцам. Калі дажджоў у гэтую пару мала, варта рэгулярна паліваць агародніння культуры. Пры недахопе вільгаці караняплоды драбнеюць і становяцца жорсткімі, валакністымі. Калі таматы і капусту паліваць нераўнамерна, то падсушваючы, то заліваючы вадой, памідоркі і капусныя качаны пачнуць рэпацца.

У квяцістай капусты прыцяняюць галоўкі, звязваючы або злёгку надломваючы лісце: на сонейку суквецці цямнеюць і атрымліваюцца больш дробнымі. Па меры паспявання галовак пачынаюць уборку ўраджаю.

У парніках і цяпліцах збіраюць таматы і перац. Здымаць ураджай варта рэгулярна, не перастрымліваючы плады на раслінах. Адначасова выдаляюць выродлівыя, пашкоджаныя завязі, лішнія кветкавыя гронкі на таматах.

Рэгулярна збіраем ураджай кабачкоў і патысонаў. Улічыце, што белаплодныя гатункі, як правіла, старэюць хутчэй — іх лупіна грубее, насенне пакрываецца шчыльнай абалонкай. Для зімовага захоўвання патрэбны выспелыя плады, а вось для ўжывання ў свежым выглядзе лепш здымаць маладыя кабачкі з далікатнай мякаццю і тонкай лупінай.

Цалкам спыняюць паліў, рыхленне і падкормкі цыбулі і часнаку. У рэпчатай цыбулі адграбаць рукамі зямлю ад цыбулін — гэта спрыяе іх пасяванню.

Калі вы хочаце атрымаць яшчэ адзін ураджай агуркоў, цяпер самы час пасеяць іх зноў. Выбірайце хуткаспелыя самаплодныя (якія не патрабуюць апылення) гатункі і абавязкова паклапаціцеся аб укрыцці — ночы хутка стануць халоднымі. Можна высейваць агуркі непасрэдна ў грунт на градкі, якія вызваліліся, або ў торфаперагнойныя гаршкі — на расаду (калі месца пакуль яшчэ занятае).

Зараз, калі травы ўдосталь і праполкай даводзіцца займацца рэгулярна, можна і трэба рабіць кампост — натуральнае і даступнае арганічнае ўгнаенне.

### САДОВЫ КЛОПАТ

У садзе наліваюцца вішні, спее ірга, на поўдні паспяваюць абрыкосы і чарэшня, а ў садоўнікаў з'яўляюцца канкурэнты: птушкі, якія дапамагалі нам змагацца са шкоднікамі, цяпер здзёўбваюць ураджай, што паспявае. Каб не застацца без ягад, выкарыстоўвайце садовыя сеткі — іх накідваюць на дрэвы і замацоўваюць на галінках. Праўда, на старых дрэвах з высокай і разгалістай кронай гэта можа быць невыканальнай задачай...

Нярэдка для абароны ад птушак выкарыстоўваюць развешаныя на галінках стужкі, палоскі фольгі або поліэтыленавай плёнкі і гэтак далей. Ставяць пудзелы, круцёлкі... Але кемлівыя птушкі даволі хутка прывыкаюць да ўсіх гэтых хітрыкаў і перастаюць звяртаць на іх увагу, так што садоўніку даводзіцца праяўляць вынаходлівасць, ратуючы свой ураджай.

Калі яблыні абяцаюць парадаваць добрым ураджаем, час ставіць падпоры пад галіны. Усталёўваюць іх такім чынам, каб цэнтр цяжару галінкі з пладамі прыходзіўся якраз на кропку апоры. Ніжні канец падпоры завастраюць і ўтыкаюць у зямлю, верхні пры неабходнасці дадаткова абмотваюць анучамі, каб не пашкодзіць кару дрэва.

Збіраем ураджай маліны, парэчкі і агрэсту. Улічыце, што чорная парэчка, саспеўшы, хутка пачынае абсыпацца, перасплелыя ягады лопаюцца, таму марудзіць з яе ўборкай не варта. Чырвоная і белая парэчка захоўваецца на кусце даўжэй, але, калі надвор'е дажджлівае, ягады могуць рэпацца. Агрэст для нарыхтовак (кампотаў, варэння) лепш збіраць крыху недаспелым.

### ДОГЛЯД ЗА ГАЗОНАМ І ВАДАЁМАМ

Газонная трава ў разгар лета (асабліва пасля дажджоў) расце вельмі хутка, таму касіць яе давядзецца часцей. Калі момант прапушчаны, замест роўнага зялёнага «дыванка» пасля скошвання можна атрымаць жорсткую «шчотку», па якой хадзіць не вельмі прыемна, ды і выгляд ужо зусім не той...

Вада ў непраточных дачных сажалках у спякоту нярэдка «зацвітае» — становіцца зялёнай, каламутнай, набывае непрыемны пах. Збольшага вырашыць гэтую праблему можа правільны выбар раслін: многія з іх валодаюць натуральнай здольнасцю ачышчаць ваду. Дапамагаюць і розныя тэхнічныя прылады — фільтры, аэратар. Ну і, вядома ж, догляд: рэгулярная ачыстка вадаёма захавае яго прыгажосць на ўвесь сезон.

### ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

Надышла пара рыхтаваць сховішчы да прыёму будучага ўраджаю. Лепш не адкладваць гэтую працу — зараз самы спрыяльны час для прасушкі склепаў. Неабходна таксама праверыць іх стан і, калі спатрэбіцца, заняцца рамонтам, прыборкай, ачысткай ад леташняга смецця.

Каб ураджай добра захоўваўся, важна паклапаціцца аб дэзынфекцыі склепа (улічыце, што апрацоўку хлорнай вапнай, якая дэзынфіцыруе, рэкамендуюць праводзіць не пазней чым за 40 дзён да закладкі агародніны на захоўванне). Пасля апрацоўкі памяшканне трэба зноў праветрыць і прасушыць.

# Як не падпусціць фітафтору да памідора?



**Вырошчванне памідораў — нескладаная рэч. Ды толькі ёсць такая «засада», як фітафтароз. Як толькі пайшлі дажджы, пахаладала — для фітафторы наступае свята... Што можна зрабіць для яе прафілактыкі?**

### АБЕЗЗАРАЖВАЕМ ГЛЕБУ І ІНВЕНТАР

Калі на ўчастку ўжо пасялілася фітафтора, трэба абавязкова знішчыць усе хворыя расліны, падвязачны матэрыял, апрацаваць калкі, да якіх падвязваюцца таматы — інакш гэтыя прадметы стануць выдатным прытулкам заразы і сховішчам будучай інфекцыі. Калі вы вырошчвалі таматы ў цяпліцы, то і пра цяпліцы трэба паклапаціцца.

### НЕ ПАВЫШАЕМ ВІЛЬГОТНАСЦІ ПАВЕТРА!

Адзін з самых дзейсных спосабаў — не дапусціць высокай вільготнасці і проста не даць магчымасці трапіць інфекцыі ўсярэдзіну расліны. Вядома, што споры фітафторы могуць пракрасціся ў вусцейкі раслін толькі ў вільготным асяроддзі — у кроплях вады.

Каб дадаткова да дажджоў і туманаў не ствараць фітафторы спрыяльных умоў, спрактыкаваныя агароднікі паліваюць памідоры толькі пад куст, пакідаючы лісце і сцёблы сухімі.

### ВЫКАРЫСТОЎВАЕМ СІДЭРАТЫ

Што такое сідэраты? Гэта расліны, якія спецыяльна вырошчваюць на агародных, садовых участках для таго, каб яны:

♦ хутка набралі зялёную масу, якую можна скасіць і прымяніць альбо як угнаенне (калі закапаць яе ў глебу), альбо як глебаахоўны слой (калі пакінуць яе пад культурнымі раслінамі і вакол іх);

♦ сваімі каранямі ўзбагацілі глебу мікраэлементамі (азотам, напрыклад) і разрыхлілі яе (на месцы згнілых каранёў застаюцца шматлікія канальчыкі для натуральнай аэрацыі глебы);

♦ прыгняталі пустазельныя травы за кошт свайго хуткага развіцця (як надземнай часткі, так і каранёвай сістэмы).

### УЖЫВАЕМ ХІМІЧНЫЯ І БІЯПРЭПАРАТЫ

Калі вашы плантацыі таматаў вялікія, змагацца з фітафтарозам народнымі спосабамі будзе вельмі цяжка. Тады на дапамогу прыйдуць хімічныя і біяхімічныя прэпараты прамысловай вытворчасці.

**Хімічныя прэпараты**

Іх шмат. Але фітафтора — хітры грыб, ён выдатна прыстасоўваецца да ядахімікатаў, і, каб дасягнуць патрэбнага эфекту, нам прыйдзецца запасацца двума, а то і трыма прэпаратамі.

**Біяпрэпараты**

У састаў такіх прэпаратаў уключаны асаблівыя бактэрыі ў неактыўнай форме. Пры растварэнні сродку ў вадзе яны пачынаюць хутка размнажацца. У розных біяпрэпаратах — розныя бактэрыі, якія знішчаюць узбуджальнікаў захворвання. Калі «карысныя» бактэрыі размножацца, мы апрацоўваем гэтым растворам расліны — і «карысныя» бактэрыі знішчаюць «шкодных».

Гэтыя сродкі менш эфектыўныя, чым агрэсіўныя хімічныя прэпараты, але больш экалагічныя. Добра вядомыя дачнікам біялагічныя бактэрыцыды і фунгіцыды «Байкал-ЭМ-1», «Трыхафіт», «Фітаспарын-М» і іншыя.

Даты | Падзеі | Людзі

**15 ЛІПЕНЯ**

**1410** год — на тэрыторыі Усходняй Прусіі, паміж сёламі Грунвальд і Таненберг адбылася вырашальная бітва «Вялікай вайны» 1409—1411 гадоў паміж нямецкімі рыцарамі Тэўтонскага ордэна і саюзнай арміяй Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, у складзе якой змагаліся таксама чэшскі і татарскі атрады. Бітва пачалася апоўдні з наступлення лёгкай літоўска-татарскай конніцы на левы фланг тэўтонцаў. Гэтая атака была сустрэтая артылерыйскім залпам — першым у гісторыі, але малапаспяховым прымяненнем палявой артылерыі. У адказ пачалося контрнаступленне цяжкай ордэнскай кавалерыі, якая пацясніла літоўцаў і татараў. Адначасова немцы сутыкнуліся з моцным супраціўленнем пяхоты ВКЛ, што прыкрывала баявыя парадкі польскіх войскаў ад флангавага ўдару падчас адступлення літоўскай конніцы. На дапамогу гэтым палкам вялікі князь літоўскі Вітаўт выслаў падмацаванне. Каб выправіць сітуацыю, Вялікі магістр ордэна Ульрых фон Юнгінген увёў у бой другую лінію тэўтонскай кавалерыі, аднак палякі таксама задзейнічалі рэзерв, якім камандаваў кароль Уладзіслаў (Ягайла). У гэты час літоўская конніца паспяхова вярнулася на поле бою і нанесла моцны ўдар па левым флангу ордэна. Падчас гэтага сутыкнення загінуў сам ордэнскі магістр. Пасля гібелі фон Юнгінгена і капітуляцыі часткі тэўтонскіх войскаў, астатняя ордэнская армія кінулася на ўцёкі. У гэтай бітве загінула каля траціны тэўтонцаў, у тым ліку практычна ўвесь камандны склад ордэна, значная колькасць рыцараў трапіла ў палон. Грунвальдская бітва нанесла смяротны ўдар па нямецкай экспансіі на Усход, мэтай якой было заваяванне літоўцаў і славян.

**1606** год — нарадзіўся Харменс ван Рэйн Рэмбрант. Ён быў восьмым з дзевяці дзяцей у сям'і млынара. Рэмбрант наведваў лацінскую школу пры Лейдэнскім універсітэце, але найбольшую цікавасць праяўляў да жывапісу. У 13 гадоў ён быў аддадзены вучыцца выяўленчаму мастацтву лейдэнскаму гістарычнаму жывапісцу Якабу ван Сваненбурху. Потым, пасля кароткачасовага знаходжання ў Лейдэнскім універсітэце, Рэмбрант цалкам прысвяціў сябе мастацтву. Творы Рэмбранта вызначаюцца незвычайнай жыццёвасцю і глыбінёй чалавечых вобразаў. Ён пісаў пераважна партрэты, біблейскія і міфалагічныя сцэны. Пад яго пэндзлем яны ператвараліся ў поўны велізарнай псіхалагічнай выразнасці аповед аб чалавечых пачуццях і адносінах.

**1900** год — 115 гадоў таму нарадзіўся (вёска Агароднікі, цяпер Пастаўскі раён) Уладзімір Дубоўка, беларускі паэт, празаік, перакладчык, крытык. У 1918 годзе скончыў Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю, у 1924-м — Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя В. Брусава. Настаўнічаў, працаваў інспектарам беларускіх школ Наркамата асветы РСФСР. Выкладаў беларускую літаратуру ў Камуністычным універсітэце народаў Захаду (1924—1927), у 1926—1930 гадах — рэдактар «Збору законаў і загадаў Рабоча-Сялянскага ўрада Саюза ССР». Нягледзячы на тое, што пастаянна жыў у Маскве, браў актыўны ўдзел у беларускім літаратурным руху — член літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша».



Першы рэдактар часопіса «Беларускі піянер». Каб пазбегнуць цэнзуры, некаторыя вершы друкаваў у заходнебеларускім часопісе «Беларуская культура». У 1930 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1957-м. Аўтар паэтычных зборнікаў «Страма», «Там, дзе кіпарысы», «Трысцё», «Credo», «Наля», галоўнай тэмай якіх становіцца ідэя адраджэння краіны, заклік да высакароднай дзейнасці дзеля краю і народа. Пісаў для дзяцей. Аўтар артыкулаў пра беларускую літаратуру, літаратурную мову, фальклор, нацыянальную культуру. Выступаў як перакладчык. Памёр у 1976 годзе.

Было сказана

**Валянціна АКОЛАВА, паэтэса:**
*«Жыццю не зблытаць белай фарбы з чорнай».*

### СТВОРЫМ РАЗАМ «КНІГУ-АРТ»

У верасні юнацкаму руху ў Беларусі споўніцца 85 гадоў. Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства запрашае ўсіх неабыякавых да прыроды творчых людзей далучыцца да руху мэйл-арт і прыняць удзел у праекце «Юннатцы-85». Для гэтага да 28 верасня трэба адправіць паштоўку або канверт, зроблены ўласнымі рукамі, на адрас: **220114, г. Мінск, вул. Макаёнка, 8, Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства з пазнакай «Юннатцы-85» або «Віншую!».**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАЛЕЙЧУКУ Аляксандру Іванавічу**

Шаноўны Аляксандр Іванавіч!
Шчыра віншуем Вас з 60-м Днём нараджэння!

*Жадаем шчасця мы ў жыцці,*
*Дарог шырокіх, перамог.*
*Да мэты ўпэўнена ісці*
*З працоўным людам*
*без трывог.*

Моцнага Вам здароўя, ладу ў сям'і і даўгалецця!

*Аляксандр Лявонцьевіч АНДРЫЕВІЧ, старшыня Пінскага райаграпрамсаюза*

УНП 201016437

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.57 | 21.36 | 16.39 |
| Віцебск — | 4.39 | 21.32 | 16.53 |
| Магілёў — | 4.46 | 21.24 | 16.38 |
| Гомель — | 4.52 | 21.13 | 16.21 |
| Гродна — | 5.14 | 21.49 | 16.35 |
| Брэст — | 5.23 | 21.41 | 16.18 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 8 ліпеня. Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**

***Пр.** Арсена, Васіля, Ціхана.*
***К.** Генрыха, Давыда, Уладзіміра.*

Фота Надзеі БУЖАН.



## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +21..+23°C | КІЕЎ +22..+24°C | РЫГА +21..+23°C |
| ВІЛЬНЮС +18..+20°C | МАСКВА +19..+21°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +17..+19°C |

### УСМІХНЕМСЯ

**Кожны чалавек мае права на памылку... А ў жанчын наогул безліміт!**

Сустракаюцца дзве планеты. Першая пытаецца:

— Ну, як твае справы?

— Дрэнна, — адказвае другая, — на мне завяліся людзі. Увесь час нешта бураць, узрываюць, паляць, калупаюць. Сверб невыносны!

— Нічога, пацярпі крыху, у мяне таксама былі. Прайшлі...

**Фёдар Конюхаў, знакаміты адзінкавымі кругасветнымі падарожжамі на яхце, зараз плануе перасекчы Аўстралію на вярблюдзе, прычым тройчы. Фёдар катэгарычна адмаўляе сувязь паміж яго шматгадовымі падарожжамі і тым, што ў яго доме пастаянна жыве цешча.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.569. Індэкс 63850. Зак. № 2813.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 ліпеня 2015 года.